КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY
Выдаецца з кастрычніка 1991 г.
№ 11 (1450)
14 сакавіка 2020 г.

15 сакавіка — Дзень Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь

Прэм'ера

На наступным тыдні, 19 сакавіка, у пракат выходзіць новы беларускі мастацкі фільм, пра які цягам апошняга года мы неаднойчы чулі, якога з цікавасцю чакалі — "Авантуры Пранціша Вырвіча". Гэта касцюміраваная, прыгодніцкая карціна — што ўжо рэдкасць для прадукцыі "Беларусьфільма", здымаліся ў ёй толькі беларускія акцёры — такім было прынцыповае рашэнне прадзюсараў, у аснове — папулярны ў беларускага чытача гісторыка-прыгодніцкі раман Людмілы Рублеўскай "Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега". Такім чынам, фільм па многіх пунктах можна назваць сапраўды беларускім. Пранціша Вырвіча сыграў малады акцёр Георгій Пятрэнка — для яго гэта першая галоўная роля ў вялікім кіно. Але зусім невядомым Георгія не назавеш — у паслужным спісе ўжо нямала серыялаў, асобныя гледачы нават пазнаюць яго ў твар. Аднак хіба можа гэта параўнацца з сапраўдным, поўнаметражным фільмам, ды яшчэ з такой цікавай і значнай роллю? І пра фільм, і пра асаблівасці жыцця беларускіх акцёраў мы пагаворым з Георгіем Пятрэнкам.

"Я іграў самога сябе"

Фота Ганны БАРАЗНЫ

Соцыум

ЯК АБ'ЯДНАЦЬ КУЛЬТУРУ З АГРАТУРЫЗМАМ?

Круглы стол пра турыстычны бізнес у вясковым антуражы. Што тут крута, прэстыжна і прыбыткова? У чым тут "фішка"?

ст. 4

Майстэрня

ВІБРАЦЫІ, ЯКІЯ АДЧУВАЕМ ПАЎСЮЛЬ

Пра ўласныя тэхналогіі ўпрыгожвання шкла, "Партызанскую архітэктуру", камяні, пясок і паветра – з нагоды выставы ў Нацыянальным мастацкім музеі вялікае інтэрв'ю аўтару "К" Іне Наркевіч дала мастачка Вольга Сазыкіна.

ст. 7

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ.

З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

Асноўнага закона карані

"Правобраз еўрапейскай Канстытуцыі" — выстава рарытэтаў з Беларусі і Латвіі, прымеркаваная да Дня Канстытуцыі, адкрыецца 16 сакавіка 2020 года ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Беларусы былі аднымі з першых у свеце, хто займеў канстытуцыйнае заканадаўства. Статут Вялікага Княства Літоўскага, складзены па-беларуску і зацверджаны ў 1588 годзе, меў усе рысы сапраўднай Канстытуцыі. Яго з'яўленне паставіла наш народ на п'едэстал пачынальнікаў канстытуцыйнага заканадаўства ў Еўропе і свеце.

Вельмі паказальна, што старажытная беларуска-літоўская Канстытуцыя была перанятая многімі іншымі народамі і стала асновай прававой сістэмы розных краін. Статут ВКЛ 1588 года выкарыстоўваўся пры кадыфікацыі прускага права ў канцы XVI стагоддзя, складанні Саборнага ўлажэння 1649 года ў Расіі, быў пісьмовым зводам дзеючага права і ўжываўся ў судах на тэрыторыі Літвы, Латвіі, Польшчы, Расіі, Украіны, Эстоніі.

З гэтай мэтай Статут перакладаўся на замежныя мовы, на якіх таксама меў афіцыйнае выкарыстанне. Так, у XVII — XIX стагоддзях ён быў перакладзены на рускую, украінскую, нямецкую, французскую, лацінскую мовы. Фактычна, ён стаў правобразам еўрапейскай Канстытуцыі, пабудаванай на прынцыпах дэмакратыі, роўнасці, справядлівасці, вяршэнства права.

На выставе ўпершыню будзе прадстаўлены шырокай публіцы амаль нікому невядомы спіс Статута ВКЛ 1588 года ў перакладзе на нямецкую мову пачатку XVIII стагоддзя са збору адной са старэйшых бібліятэк Еўропы — Акадэмічнай бібліятэкі Латвійскага ўніверсітэта. Ён з'яўляецца сведчаннем афіцыйнага выкарыстання беларуска-літоўскай протаканстытуцыі на землях Латвіі і сведчыць пра старажытныя культурныя, эканамічныя і палітычныя сувязі нашых народаў. Таксама на выставе можна будзе пабачыць друкаваныя асобнікі Статута XVII — XIX стагоддзяў з фонду Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі на іншых еўрапейскіх мовах, якія сведчаць пра шырокі ўплыў беларускай прававой культуры на фарміраванне міжнароднага канстытуцыйнага заканадаўства.

Выстава арганізаваная пры ўдзеле Пасольства Рэспублікі Беларусь у Латвійскай Рэспубліцы і Акадэмічнай бібліятэкі Латвійскага ўніверсітэта.

КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА) Выдаецца з кастрычніка 1991 года.

Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Адказны сакратар — Юрый КАРПЕНКА; **рэдактары аддзелаў:** Надзея БУНЦЭВІЧ, Яўген РАГІН; **агляльнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Алег КЛІМАЎ, Надзея КУДРЭЙКА, Антон РУДАК, Ілья СВІРЫН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльны карэспандэнт:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Таццяна ПАШЭНЬКА.
Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэклама аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".
Дырэктар — СЛАБОДЗІЧ Ірына Аляксееўна;
першы намеснік дырэктара — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксееўна.
Прыёмная: (017) 334 57 41.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.
©"Культура", 2020.
Наклад 3348. Індэкс 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці.
Падпісана ў друк 13.03.2020 у 18.00. Замова 903.
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку".
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Якім быў шлях да Вялікай Перамогі?

17 сакавіка ў 11 ў галерэі "Атрыум" (3-ці паверх) Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі пройдзе адкрыццё гісторыка-дакументальнай выстаўкі "Шлях да Перамогі: гістарычныя крыніцы сведчаць", прымеркаванай да 75-годдзя вызвалення Усходняй Еўропы ад нацызму.

Экспазіцыя складаецца з 30 планшэтаў, якія адлюстроўваюць падзеі тых гадоў. Наведвальнікі выставы азнаёмяцца з фотаздымкамі, дакументамі, фактычнымі дадзенымі, картамі, плакатамі, старонкамі перыядычнага друку, сцягамі, замалёўкамі, узнагароднымі лістамі і іншымі матэрыяламі аб вызваленчым руху Усходняй Еўропы ад нацызму.

Унікальныя матэрыялы, у тым ліку тыя, што доўгі час захоўваюцца пад грыфам "цалкам сакрэтна", сведчаць аб ходзе баявых дзеянняў, палітыка-маральным стане частак Чырвонай арміі, а таксама аб узаемадзеянні з мясцовымі органамі кіравання па наладжванні інфраструктуры і мірнага жыцця, аб гуманітарнай дапамозе, якая аказвалася савецкімі салдатамі мясцоваму насельніцтву.

Арганізатары выставы — Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Пасольства Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь, Расійскае ваенна-гістарычнае таварыства і Фонд "Гісторыя Айчыны" пры ўдзеле Міністэрства культуры Расійскай Федэрацыі і Расійскага ваенна-гістарычнага таварыства.

Краязнаўчы форум, які мусіць стаць традыцыяй

12 — 13 сакавіка ў Нацыянальным гістарычным музеі ў рамках Года малой радзімы адбыўся I Рэспубліканскі краязнаўчы форум Беларусі, арганізатарамі якога выступіў таксама Беларускі фонд культуры пры падтрымцы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Партнёры форуму — Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Саюз пісьменнікаў Беларусі і Выдавецкі дом "Звязда".

Антон Рудак / Фота аўтара

Падчас пленарнага пасяджэння.

На адкрыцці форуму выступіла першы намеснік міністра культуры Наталля Карчэўская, зачытаўшы прывітальны адрас ад імя міністра культуры Юрыя Бондара, які выказаў спадзяванне, што правядзенне краязнаўчага форуму на рэспубліканскім узроўні зробіцца добрай традыцыяй.

З прывітальным словам да ўдзельнікаў форуму звярнуўся таксама старшыня пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па навуцы, культуры і адукацыі Ігар Марзалюк, які прыгадаў падзеі ўстаноўчага з'езду Беларускага краязнаўчага таварыства, што адбыўся ў 1989 годзе, і імёны даследчыкаў, якія пакінулі нас за гэты час, пажадаўшы прысутным захоўваць любоў да радзімы, якая ляжыць у аснове краязнаўства.

У форуме прынялі ўдзел каля 230 краязнаўцаў, супрацоўнікаў устаноў культуры, адукацыі, навукі і інфармацыі, студэнтаў і навучэнцаў, наведвальнікаў устаноў дадатковай адукацыі, прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый.

Праца секцый форуму была прысвечаная ролі краязнаўства ў сістэме навукова-даследчай працы і вучэбна-выхаваўчым працэсе ўстаноў адукацыі, экалагічнаму краязнаўству і турызму, пазашкольнаму краязнаўству ў рэгіёнах, а таксама гісторыі біяграфій беларускіх краязнаўцаў.

У межах форуму адбыліся прэзентацыі найбольш цікавых краязнаўчых праектаў і выстава літаратуры па гэтай тэме з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, а таксама выданняў краязнаўцаў. 13 сакавіка, калі гэты нумар быў падпісаны ў свет, падводзіліся вынікі конкурсу на найлепшае краязнаўчае выданне за 2017 — 2019 гады, у якім удзельнічалі больш за 200 кніг. Аб выніках форуму і лаўрэатах конкурсу "К" паведаміць у наступным нумары.

К

На выставе гісторыка-краязнаўчай літаратуры.

Мацей Бурачок запрашае

21 сакавіка спаўняецца 180 гадоў з дня нараджэння Францішка Багушэвіча — паэта-дэмакрата, публіцыста, перакладчыка, аднаго з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры і народнага адваката. 30-годдзе адзначае і Музей-сядзіба Францішка Багушэвіча "Кушляны". 19 сакавіка Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры запрашае на адкрыццё часовай літаратурна-дакументальнай экспазіцыі "Блаславёныя Кушляны Францішка Багушэвіча".

Экспазіцыя адлюстроўвае найперш родныя мясціны творцы. Сядзіба Багушэвічаў у Кушлянах непарыўна звязана з лёсам пісьменніка: тут ён рос, сталеў, тут памёр. Сярод экспанатаў — рэчы сям'і пісьменніка, радавод Багушэвічаў, рарытэтныя выданні твораў і фотаздымкі з маляўнічымі краявідамі кушлянскага кутка, якія не маглі не паўплываць на творчасць пісьменніка.

У мерапрыемстве будуць браць удзел літаратуразнаўцы і даследчыкі Язэп Янушкевіч, Кастусь Цвірка, краязнаўца і складальнік радавода Багушэвічаў Васіль Юрша, архівіст-гісторык Зміцер Юркевіч.

Падчас адкрыцця імпрэзы будуць агучаны ўмовы сумеснай з бібліятэкай № 14 імя Францішка Багушэвіча акцыі "Дудка грае".

Калектыў Вялікага тэатра Беларусі глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю народнай артысткі Беларусі, салісткі оперы ў 1965 — 1995 гадах Ірыны Сямёнаўны Шыкуновай і выказвае шчырыя спачуванні яе родным і блізкім.

Формы і эмоцыі Пластформы

Ужо сёння — 14 сакавіка — распачынаецца адзін з самых незвычайных фестываляў Беларусі — форум пластычных і танцавальных тэатраў Plastforma. Гледачоў чакае пяць цалкам непадобных адзін да аднаго спектакляў, а таксама адмысловая адукацыйная праграма, прымеркаваная да падзеі.

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

Напрыклад, сёння ў Музеі-майстэрні Заіра Азгура адбудзецца першая сустрэча з невялікага цыкла, прысвечанага сучаснаму тэатру — "Чалавек. Прадмет. Прастора: дзве бяседы пра тэатр, дзе тэкст не галоўнае". Даследчыцы і крытыкі Алена Мальчэўская і Арына Каліміліна падзеляцца з публікай этапамі развіцця сучаснага тэатральнага працэсу, дзе выключна драматычны тэатр ужо не з'яўляецца "флагманам". "Як пераўтварыць ложак у глядзельную залу? Ці можна паглядзець спектакль на могілках? І ці патрэбна акцёру яго "роднае", паўсядзённае цела на сцэне?" — эксперты прывядуць прыклады самых незвычайных пастановак свету.

І ўжо з 18 сакавіка — пагрузіцца ў непасрэдна практычную частку фестывалю запрашае першае шоу праграмы — "Вітаючы сонца". Яго рэжысёрам выступае харэограф Іна Асламава арт-дырэктарка, ды адна з заснавальніц танцавальнага форуму. Спектакль, які быў прэзентаваны пэўны час таму, адмыслова да Пластформы — 2020, атрымаў новае ўвасабленне. "Бягучую яго версію ў поўнай меры можна лічыць прэм'ерай, — удакладняе Іна Асламава. — Мы яго развілі, дапрацавалі — шмат увагі было нададзена відэа-арту Аляксея Далгушына. Не варта скідваць з рахунку і саўнд-дызайн Весяліна Румянцава". Але аснова пастаноўкі — спалучэнне танца і этнамузыкі, своеасаблівага дыялогу, што мусіць увесці гледача ў стан пачуццёвага і эмацыйнага. "Нагадаю, што "Вітаючы сонца" — гэта сумесны праект з выдатным этнамузыкантам і спявачкай Ірэнай Катвіцкай, — дзеліцца харэограф. — Мы злучылі ў адным дзеянні этна-вакал, электронную музыку і contemporary dance. І ў выніку атрымаўся спектакль-абрад, які ўпісвае старажытную жаночую магію ў сучасны кантэкст". Увогуле, нечаканае асэнсаванне традыцыі і сучаснасці — адметнасць гэтай пастаноўкі.

Фота Дз. Мацвеева.

"Пад плоццю".

Фота Н. Кірылка.

"Арчы&Кэт".

Цікава, што музыка і танец стануць галоўнымі стыхіямі яшчэ ў адным беларускім прадстаўленні. Гаворка — пра спектакль "Танец-інструмент" у Беларускім дзяржаўным акадэмічным тэатры юнага глядача, у якім у своеасаблівым дуэце выступяць вядомая выканаўца сучаснага танца Вольга Скварцова і Minsk Improvisers Orchestra на чале з музыкантам і кампазітарам Аляксеем Варсобай. Гэта будзе татальная імправізацыя на пэўную тэму, якую артысты пакуль трымаюць у сакрэце. Імправізацыя з боку музыкантаў і танцораў мусіць выліцца ў нешта сапраўды ўнікальнае, абяцае эксперт.

І "трэцім акордам" у беларускай праграме стане пастаноўка вядомага праекта "Арт-карпарэйшн" — "Arche&Ket", якая спалучае ў сабе тры мовы: уласна танца, тэатра і медыя. Тое перформанс аб каханні, і, як абяцаюць яго стваральнікі, "гэты спектакль цябе разбярэ". Яго рэжысёрамі выступілі Антон Макуха (пастаноўка) і Ірына Шырокая (харэаграфія). "Як часта чалавек разважае аб каханні. Не адчувае, не абмяркоўвае, а разважае. Думае пра яго. Верыць ці адмаўляе яго існаванне. Уцякаючы ад пераследавання, Арчы і Кэт зноў і зноў узнаўляюць сваю гісторыю ў дэталях. Імгненні, якія б змянілі ўсё, секунды, у якіх усё магло б быць іначай — ці магчыма іх дагнаць?", — п'еса грузінскага аўтара Дзімітрыя Учанеішвілі атрымоўвае ў трактоўцы беларускіх аўтараў цалкам нечаканае пластычнае ўвасабленне.

Замежная частка Пластформы выглядае зусім не горш. Нягледзячы на тое, што дзве пастаноўкі фестывалю былі перанесены ў сувязі з пандэміяй каронавіруса, два перформансы, якія ўбачаць мінскія гледачы, з'яўляюцца вартымі несумненнай увагі.

Той жа спектакль-выказванне "Пад плоццю" ліванскага артыста Bassam Abou Diab. Гэта незвычайны перформанс, які даследуе цела... у сітуацыі вайны. "Як рэагуе цела на смяротную пагрозу, сыходзячы з інстынкту самазахавання, і як інстынкт пераўтвараецца ў танец? Танец, заснаваны на ўяўных правілах і метадах, якія былі прыдуманыя як казка, каб пераадолець ваенную машыну. Гэта асабістая гісторыя, гісторыя цела, што перажыло чатыры вайны", — такое апісанне праекта даецца ў анатацыі. Іна Асламава, якая разам з Марыяй Фаменка працавала над праграмай фестывалю, адзначае, што ўбачыла пастаноўку Басама Абу Дыяба ў Вільнюсе на фестывалі New Baltic Dance. І яна моцна яе ўразіла. "Вельмі ўражальныя ідэя і выкананне, — адзначае арт-дырэктарка. — Самая нечаканая рэфлексія аб вайне, якую я бачыла".

І пастаноўка аўстрыйскага харэографа Вілі Дзёрнера прапануе нам адкрыць для сябе, якім чынам нараджаецца думка. Так, думка, але менавіта праз танец, рухі, таксама лічбы, лініі і літары. "One" ("Адзін") — гэта прадстаўленне для двух танцораў, крыніцай натхнення для якога з'яўляюцца вершы аўстрыйскага мастака візуальнай паэзіі Хайнца Гапмайра, — раскрываюцца падрабязнасці ў анатацыі. — У сваёй творчасці ён выкарыстоўваў знакі, літары і лічбы, таксама лініі і кропкі. І асобае месца сярод важных знакаў займала лічба 1". Арт-дырэктар форуму каментуе свой выбар так: "Гэта пастаноўка, жанр якой вельмі складана вызначыць. Камера здымае анлайн усё, што адбываецца на вялікім стале. Гэта танец слоў, думак і дзеянняў, што нараджаюць вобразы. Узнікае адчуванне, што цяпер ты ведаеш, якім чынам выглядаюць думкі". Адзінае, аб чым просяць артысты, — гэта базавае веданне англійскай. Ды і апошняе не з'яўляецца абавязковым патрабаваннем дзеля разумення "мовы" спектакля.

Іна Асламава падкрэслівае, што бягучая праграма складалася з акцэнтам на пачуццёвы і эмацыйны бок тэатра. "Часам людзям неабходна "вярнуцца" менавіта ў цела, каб зноў стаць жывымі і рэагуючымі", — кажа яна.

Прадоўжыцца VIII фестываль пластычных і танцавальных тэатраў да 21 сакавіка. Галоўнымі пляцоўкамі форуму стануць: Беларускі акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы, Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр юнага гледача, культурны хаб Ok16, Мемарыяльны музей-майстэрня Заіра Азгура.

К

Канцэрты на Вялікі пост

Гэтым тыднем пачаўся IV фестываль "Велікапосныя канцэрты", які працягнецца да 23 сакавіка. Выступленні царкоўных і свецкіх харавых калектываў спалучаюцца з найлепшай камернай класікай у выкананні найлепшых маладых музыкантаў — лаўрэатаў і дыпламатаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Сёлета фестывальная праграма атрымалася як ніколі багатай, захапіла больш, чым калі-небудзь раней, канцэртных пляцовак. Паводле традыцыі, большасць выступленняў ладзіцца ў Вялікай зале Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі: сёлета іх пройдзе тут шэсць. У сённяшнім — прагучыць камерная музыка ў выкананні творчых калектываў Акадэміі. Заўтрашні — "Музыкі цудоўныя імгненні" — прысвечаны 550-годдзю Жыровіцкай іконы Божай Маці і 500-годдзю з дня заснавання Свята-Успенскага Жыровіцкага манастыра. Учора ж удзячныя слухачы сабраліся ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка. А закрыцё фестывалю і ўвогуле пераедзе на сцэну Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. Дарэчы, гэта адзіны платны канцэрт (уваход на астатнія — вольны, па атрыманых папярэдне запрашальніках), але выручаныя грошы будуць скіраваны на дабрачынныя мэты.

Канцэртныя праграмы дапоўнены сённяшняй адкрытай спеўкай у Мінскай духоўнай семінарыі. Правядзе гэты своеасаблівы "майстар-клас" манахіня Іўліянія Дзянісава — рэгент Святочнага хору Свята-Елісавецінскага манастыра, аўтар шматлікіх твораў царкоўнай музыкі і адзін з галоўных ініцыятараў самога фестывалю.

Традыцыя правядзення падобных канцэртаў існавала ў Санкт-Пецярбургу ў XIX стагоддзі, потым была адноўлена і пачала пашырацца, распаўсюдзіўшыся і ў нас. Невыпадкова ўсе чатыры гады "Велікапосныя канцэрты" праходзяць пад дэвізам: "Адраджаем культурныя традыцыі". Да сталіцы далучаюцца і рэгіёны. Сярод сёлетніх удзельнікаў фестывалю — не толькі шматлікія харавыя калектывы з Мінска, студэнты Акадэміі музыкі і навучэнцы каледжа пры ёй, але і, да прыкладу, Народны акадэмічны хор "Белая вежа" Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта пад кіраўніцтвам Ірыны Ангалюк. А ў праграмах, акрамя духоўных песняспеваў і свецкай класікі мінуўшчыны, гучыць таксама сучасная беларуская музыка.

К

Турыстычны бізнес у вясковым антуражы — гэта крута, прэстыжна і прыбыткова. Прынамсі, менавіта на гэтых аспектах дзейнасці ўладальнікаў сельскіх аграсядзіб засяроджвалі ўвагу ўдзельнікі круглага стала, што адбыўся днямі ў Доме прэсы. І, натуральна, без культработнікаў развіццё гэтай сферы сёння немагчымае. Але аб усім па парадку.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ / Фота аўтара

Аграсядзіба "У Барысавіча" Браслаўскі раён

Чабатухі ў Стойлах.

Беларуская "фішка", або Як аб'яднаць культуру і агратурызм?

ФАКТЫ І ЛІЧБЫ

Не сакрэт, што аграэкатурызм на Беларусі развіваецца даволі паспяхова, а новыя сядзібы растуць, нібы грыбы пасля дажджу. Гэтаму значна паспрыяў Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусі № 365 "Аб развіцці аграэкатурызму". Так, па словах намесніка дырэктара Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Беларусі Віталя Грыцэвіча, калі ў 2006 годзе ў краіне было зарэгістравана толькі 34 аграсядзібы, то на 1 студзеня 2020 года іх стала ўжо 2760. Гэта амаль на 12 працэнтаў болей, чым год таму. Па колькасці аграсядзіб у лідарах Мінская вобласць — 891 аграсядзіба, далей Віцебская — 647, Брэсцкая — 423, Гродзенская — 339, Магілёўская — 229 і Гомельская — 171.

— У 2019 годзе беларускія аграсядзібы наведалі парадку 515 тысяч чалавек (на 22 працэнты больш, чым у папярэднім годзе), з якіх 60 тысяч — гэта замежныя грамадзяне з 78 дзяржаў, — адзначыў Віталь Грыцэвіч. — Найбольшая колькасць замежных гасцей прыбыла з Расіі, Польшчы, Узбекістана, Украіны і Латвіі.

Дарэчы, за 2019 год турысты пакінулі у айчынных аграсядзібах 25,5 мільёнаў рублёў, што на 27,5 працэнтаў больш, чым годам раней. У лідарах тут выступае Мінская вобласць — прыезджыя госці аплацілі турыстычныя паслугі на вёсцы на суму амаль у 11 мільёнаў рублёў.

— Можна сказаць, што агратурызм стаў адной з "фішак" Беларусі, дзякуючы якой нашу краіну пазнаюць у свеце, — адзначыў Віталь Грыцэвіч.— Акрамя таго, у Беларусі фарміруюцца турыстычныя кластары са сваёй унікальнай спецыфікай і нацыянальным каларытам.

ПРАБЛЕМЫ НАВІДАВОКУ?

Словы прадстаўніка Міністэрства спорту і турызму пацвердзіла і старшыня праўлення грамадскага аб'яднання "Адпачынак у вёсцы" Валерыя Кліцунова.

— Так, нягледзячы на пэўныя негатыўныя эканамічныя з'явы, аграэкатурызм сёння знаходзіцца ў пастаянным прыросце, — сказала Валерыя Кліцунова. — Пры гэтым у згаданай сферы засталося яшчэ шмат задум, якія нашай краіне можна і трэба рэалізаваць, бо для гэтага сёння ёсць усе ўмовы.

Разам з тым, ёсць у развіцці аграэкатурызму і пэўныя праблемныя моманты.

— Указ Прэзідэнта Беларусі сапраўды стаўся вельмі важным для развіцця аграэкатурызму і сельскай мясцовасці, але калі мы ўнеслі змены ў дакумент і прапісалі магчымасць правядзення ў аграсядзібах карпаратываў, банкетаў і ўрачыстых мерапрыемстваў, то адкрылі, хай і маленькую, але скрыню Пандоры, — адзначыў Віталь Грыцэвіч. — Скажам, колькасць скаргаў і зваротаў з гэтай прычыны ў Дэпартамент значна вырасла, і гэта праблема. Таму сёння трэба зрабіць так, каб Указ працаваў на карысць сядзібаў, якія сапраўды развіваюць агратурызм, а не робяць бізнес на правядзенні мерапрыемстваў з выплатай усяго адной базавай. І тут мы хочам параіцца наконт удасканалення згаданага Указа з уладальнікамі сядзіб, мясцовымі ўладамі і МУС, каб працягнуць дзеянне дакумента і пасля 2021 года.

Ініцыятыву аб працягу Указа з дзейснай падатковай стаўкай падтрымала і старшыня праўлення БГА "Адпачынак у вёсцы" Валерыя Кліцунова. Паводле яе слоў, уладальнікі аграсядзіб плацяць мноства ўскосных падаткаў, у тым ліку ПДВ у памеры 20 працэнтаў, а таксама ствараюць новую турыстычную інфраструктуру і працоўныя месцы ў сельскай мясцовасці.

Разам з тым, як кажа Валерыя Кліцунова, за 14 гадоў існавання аграэкатурызму многія прадстаўнікі сферы, на жаль, усё яшчэ не працуюць над новымі нацыянальнымі прадуктамі і кірункамі, якія б прыкметна вылучалі нас на фоне суседзяў. І ў гэтым таксама ёсць пэўная праблема.

Майстар-клас у "Стулах".

— Акрамя таго, мала хто задумваецца, што ў свеце сёння ўпор робіцца не на канкурэнцыю паміж суб'ектамі гаспадарання, а на кааперацыю, — кажа Валерыя Кліцунова. — Таму ўладальнікам аграсядзіб цяпер важна аб'ядноўвацца пад адным брэндам і выпрацоўваць свой унікальны для пэўнага рэгіёна прадукт.

КУЛЬТУРА — У ПРЫЯРЫТЭЦЕ

Не варта і казаць, што адным з такіх каларытных і самабытных прадуктаў могуць быць мясцовыя культурныя традыцыі.

— Напрыклад, адна вядомая ткачыха з Маларыты дэкарыруе сваю аграсядзібу і падтрымлівае такім чынам векавыя традыцыі беларускай вёскі, — кажа Валерыя Кліцунова. — Ёсць і яшчэ адзін знакаміты прыклад: аграсядзіба "Стулы", якую не так даўно адкрыла ў вёсцы Стойлы Пружанскага раёна культработнік Ларыса Быцко. Разам з мужам яны ладзяць на сядзібе традыцыйныя беларускія палескія вяселлі, прапануюць адметную палескую ежу. На падобныя прыклады трэба сёння звяртаць увагу ўсім уладальнікам аграэкасядзіб.

Натуральна, што ўзаемадзеянне паміж аддзеламі культуры і ўласнікамі аграсядзіб — гэта таксама даволі перспектыўны шлях развіцця турыстычнага бізнесу на вёсцы.

— Кожны ўладальнік аграсядзібы жадае, каб людзі прыязджалі да яго не на дзень, а як мінімум на тыдзень, — кажа Валерыя Кліцунова. — Такім чынам, наступны лагічны крок на шляху развіцця аграэкатурызму, як я мяркую, — распрацоўка культурнай праграмы, планаванне вольнага часу турыстаў... А гэта і паказ абрадаў, і аўтэнтычныя спевы і танцы, і прыгатаванне кулінарных вырабаў. Бо духоўная спадчына беларусаў выклікае заўсюдную цікавасць у замежнікаў.

Паводле слоў эксперта, як паказвае практыка, трэба адмаўляцца ад сцэнічных варыянтаў выступленняў, а зрабіць акцэнт на інтэрактыўныя праграмы ды майстар-класы, каб той жа турыст павучыўся спяваць, выканаўшы куплет адной з песень, каб ён не толькі змог паглядзець, як працуе майстар, а і сваімі рукамі зляпіў бы збаночак ці гліняную свісцёлку...

Дарэчы, як адзначыў "К" уладальнік аграсядзібы "Ганка" Анатоль Ганец, яго дзейнасць проста немагчымая без супрацоўніцтва з мясцовымі калектывамі з Валожынскага раёна.

— Мы пастаянна ладзім на сваёй аграсядзібе мерапрыемствы з удзелам творчых калектываў сельскіх дамоў культуры, што знаходзяцца непадалёку, — кажа Анатоль Ганец. — Натуральна, аплачваем паслугі культработнікаў, але ўзамен атрымліваем якасны культурны прадукт, з мясцовай аўтэнтыкай і каларытам. Нашы госці заўсёды застаюцца ў захапленні ад мясцовых песень і танцаў, ад таго, што могуць сваімі рукамі змалоць зерне на муку, замясіць цеста і спячы самастойна невялікую булачку ці нават цэлы бохан хлеба...

БЕЛАРУСЬ ЯК ІТАЛІЯ?

Гастранамічная тэма, да слова, застаецца ў прыярытэце літаральна ва ўсіх уладальнікаў аграэкасядзібаў. Але, паводле Валерыі Кліцуновай, трэба абавязкова рабіць упор на рэгіянальную кухню.

— Зразумела, што можна ўсё купіць у краме, але турыстам цікава пакаштаваць прадукты па месцы іх вытворчасці, — кажа старшыня праўлення БГА "Адпачынак у вёсцы". — Умоўна кажучы, пармезан у Парме, шампанскае — у Шампані, але ў Беларусі таксама ёсць унікальныя месцы, дзе робяць незвычайныя прадукты. Напрыклад, грачаны хлеб у Маларыце, масленага барана — у Віцебскай вобласці, клёцкі з душамі — у Лепельскім раёне.

Усе гэтыя рэцэпты арыгінальных страў, сабраныя культработнікамі, натуральна, павінны быць цікавымі ўладальнікам аграсядзіб у рэгіёнах. Чаму? Па-першае, кажа Валерыя Кліцунова, каля 30 працэнтаў грошай турысты аддаюць падчас сваіх падарожжаў на ежу — гэта сусветная статыстыка. А па-другое, падчас прыёму ежы задзейнічаны ўсе органы пачуццяў і выпрацоўваюцца гармоны шчасця. І значыць, турысты не толькі застануцца задаволены прыёмам у гаспадароў аграсядзібы, але, хутчэй за ўсё, захочуць прыехаць у гэтыя мясціны зноў і зноў.

Дарэчы, па словах Валерыі Кліцуновай, у Еўропе асноўным арыенцірам для сельскага турызму з'яўляецца Італія. Беларусь магла б стаць такой Італіяй славянскага свету. Тым больш, для гэтага ў нас ёсць усе перадумовы: прыродны і экалагічны патэнцыял, унікальныя традыцыі і рамёствы, гастранамічныя цікавосткі ды многае іншае...

■■■

Напрыканцы круглага стала Віталь Грыцэвіч зазначыў, што Беларусь сёння становіцца пляцоўкай для правядзення буйных турыстычных мерапрыемстваў: напрыклад, у маі ў нашай краіне будзе ладзіцца міжнародны прадстаўнічы форум па сельскім турызме. Такім чынам, і для сусветнага грамадства Беларусь цяпер з'яўляецца адным з лідараў у развіцці аграэкатурызму. Так што далучацца да агратурыстычнага мэйнстрыму айчынным культработнікам досыць перспектыўна. Ды і пра грашовы складнік супрацоўніцтва не варта забываць: нагадаю, што госці пакінулі летась у аграсядзібах больш за 25 мільёнаў рублёў, а налета сума можа значна павялічыцца. Таму, мяркуючы па ўсім, прыкладаў паспяховага супрацоўніцтва паміж сферай культуры і агратурбізнесам з кожным годам будзе станавіцца ўсё болей і болей.

К

Выбірайце выразы!

Кансенсус як вынік

На мінулым тыдні зацягнуты на многія гады працэс рэканструкцыі Старога замка ў Гродне прайшоў сімвалічную веху: на брамнай вежы ўсталявалі купал. У Сеціве яго з'яўленне выклікала бурлівую рэакцыю. Нехта падыходзіў да справы як тонкі эстэт, нехта "тапіў за аўтэнтыку". На эпітэты некаторыя крытыкі не скупіліся: "архітэктурныя фантазіі", "чужародны элемент"… чаго там толькі не было! Зрэшты, разносіць у шматкі рэстаўрацыйныя праекты ў нас ужо стала завядзёнкай. Нават закінутыя помнікі, якія вось-вось развяляцца, не выклікаюць столькі эмоцый. Такі вось парадокс.

Ілья СВІРЫН

Апынуўшыся на мінулых выхадных у горадзе па-над Нёманам, выправіўся да замка, каб усё на ўласныя вочы ўбачыць. Сустрэў там вядомага мінскага мастацтвазнаўцу, які меў такую самую мэту. А потым — і двух аўтарытэтных гродзенскіх гісторыкаў. Вердыкт спецыялістаў быў агулам ухвальным: усе сышліся на тым, што адноўлены замак эфектна мяняе не толькі абрысы кручы па-над ракой, але і наогул уражанне ад горада.

Здавалася б, з гэтым не паспрачаешся. Як паведамлялася ў адмысловай групе ў "Фэйсбуку" (у дужках адзначу: яе ўласнаручна вядзе начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкаму Алена Клімовіч! Здаецца, прыклад, варты пераймання), да з'яўлення купала спрычынілася нямала спецыялістаў — не толькі беларускіх, але і польскіх. Таму і форма яго дбайна вывяралася. Хаця яна ў кожным разе гіпатэтычная, бо якім той купал быў насамрэч, мы можам хіба здагадвацца дзякуючы невялічкай гравюры таго часу. Гэта адзіная вядомая на сёння выява замка Баторыя, дый тое не надта дэталёвая.

Адкуль жа такі шлейф "народнага" негатыву? Без сумневу, ён з'яўляецца працягам той сітуацыі, дзякуючы якой рэстаўрацыю ў Гродне вельмі часта суправаджаюць эпітэтам "скандальная". Калі коратка, было так. Праект доўга ляжаў пад сукном (пра "хуткія планы" яго ўвасобіць мы пісалі яшчэ гадоў дзесяць таму), але ўрэшце справа зрушылася. І акурат тады на даляглядзе з'явіўся малады, але дасведчаны гісторык, які раскрытыкаваў той праект ушчэнт.

Прафану накшталт мяне можа падацца, нібы агучаныя ім праблемы не такія ўжо і вялікія — асабліва ў тым выпадку, калі мы маем справу з гіпатэтычнай (у той ці іншай меры) рэканструкцыяй. Хіба так ужо істотныя колькасць паверхаў ды іншыя дэталі? Галоўнае — гэта за дрэвамі бачыць лес. Праект важны, прыгожы, ва ўсіх сэнсах карысны — значыць, наперад!

Але спецыялісты, вядома, так не лічаць. І гатовыя адстойваць сваю праўду да апошняй кроплі крыві. Што і робіць той малады гісторык. А паколькі вынікам сваёй руплівасці ён не надта задаволены, "градус палемікі" падвысіўся — ажно да непрыстойнасці. Слова "фальсіфікацыя" было яшчэ не самым моцным сярод прамоўленых ім.

Чаму да гісторыка не прыслухаліся? Зразумець пазіцыю людзей, якія прымаюць у гэтым выпадку рашэнні, можна даволі лёгка. Бо якія альтэрнатывы? Спыніць працы на няпэўны тэрмін і даць спецыялістам магчымасць уволю паспрачацца пра важныя для сябе дэталі — без асаблівай надзеі на выніковы кансенсус? Варыянт так сабе. На рэканструкцыю замка нарэшце выдатканыя грошы, і калі іх цяпер не засвоіць... Другога такога шанцу можа і не быць. Рэстаўрацыйных "даўгабудаў" у нас, на жаль, хапае: у Навагрудку, Крэве, Гальшанах, Быхаве, Юровічах... І калі Стары замак атрымаў магчымасць пакінуць гэты пачэсны спіс (а ён туды ўжо патрапіў, бо працы там не раз прыпыняліся), грэх ёй не скарыстацца.

Ну, а калі ўжо рыгарыстычна адстойваць аўтэнтыку ды рэстаўрацыйную метадалогію... Тады крытыкам трэба было падыходзіць куды больш прынцыпова — і наогул патрабаваць адмовіцца ад усіх купалоў і вежаў. Ды дбаць пра захаванне таго не надта прывабнага выгляду, які замак меў да нядаўняга часу.

Чаму? Бо адкрыўшы Венецыянскую хартыю рэстаўратараў, мы прачытаем: "*Наслаенні розных эпох, прыўнесеныя ў архітэктуру помніка, павінны быць захаваныя*". Гэта па-другое, а па-першае — "рэстаўрацыя павінна з'яўлянца выключнай мерай". Адпаведна, калі свята і дакладна кіравацца духам і літарай аўтарытэтнага дакумента, трэба было не рэнесансавы замак аднаўляць, а закансерваваць тыя непрыглядныя казармы, у якія гэты замак пераўтварыўся за царскім часам. Хто будзе спрачацца, што іх знешні выгляд выразна адлюстроўвае сваю эпоху — калі каралеўскі некалі горад пераўтварыўся ў звычайны губернскі цэнтр вялізнай імперыі?

Але эпоха змянілася, і бачыць на такім знакавым месцы нейкія казармы нам ужо зусім не хочацца. Што ні кажы, маюць рацыю тыя, хто лічыць працу са спадчынай не столькі дакладнай навукай, дзе ўсё выразна прапісана, колькі суплётам сацыяльных камунікацый, якія абумоўленыя найперш каштоўнаснымі арыенцірамі. Добра, што хоць тут у нас кансенсус. У незалежнай Беларусі "другое нараджэнне" замка Баторыя ўспрымаецца, здаецца, выключна станоўча.

Што да згаданай хартыі... Падазраю, яе пастулаты не надта дакладна выконваюцца нават у тых краінах, якія мы заўсёды лічылі за ўзор. Аднаўленне знакавых архітэктурных здабыткаў і дасюль ідзе па ўсім свеце. Часам такія праекты таксама спараджаюць палеміку сярод спецыялістаў. І гэта нармальна. Галоўнае — захоўваць эмацыйную танальнасць і выбіраць выразы. А таксама, як казаў ужо, бачыць за дрэвамі лес. За прыватнасцямі — агульны вынік.

І ніхто не будзе спрачацца з тым, што будаўнічым працам павінны папярэднічаць навуковыя даследаванні і дыскусіі. Хочацца верыць, менавіта так усё і будзе падчас наступных чэргаў аднаўлення Старога замка.

К

Вытокі і будучыня айчыннай археалогіі

У Нацыянальным гістарычным музеі 6 сакавіка прайшоў навуковы семінар "Вытокі беларускай археалогіі. Паўночны захад: ад палеаліту да Каложы". Мерапрыемства было прымеркаванае да 205-годдзя з дня нараджэння Яўстаха Тышкевіча і 150-годдзя з дня нараджэння Іосіфа Стаброўскага. Хоць памятныя даты прыпалі на мінулы год, адзначыць іх вырашылі сёлета.

Антон Рудак

Прэнуклеус — каменная нарыхтоўка перыяду фінальнага палеаліту (11800 — 10700 тысяч гадоў да нашай эры), знойдзеная падчас даследаванняў 2019 года на археалагічным помніку Кавальцы-1 у Гродзенскім раёне (фота Аляксандра Гаршкова)

ДОСВЕД ПАПЯРЭДНІКАЎ

Археолаг і этнограф Яўстах Тышкевіч (1814 — 1873) быў заснавальнікам Віленскага музея старажытнасцяў і Віленскай археалагічнай камісіі, даследаваў курганы племені крывічоў, а таксама гарадзішчы і замчышчы на абшарах ад Крэва і да Слуцка. А краязнаўца Іосіф Стаброўскі (1869 — 1968) займаўся старажытнай гісторыяй Слонімшчыны і вывучаў курганы ў басейне Нёмана — ягоныя археалагічныя знаходкі пакладзены ў аснову Слонімскага краязнаўчага музея, дзе ён працаваў дырэктарам і захавальнікам фондаў.

Таму і семінар, што ўшаноўвае памяць гэтых славутых краязнаўцаў, быў прысвечаны археалогіі рэгіёнаў, якія яны даследавалі — Павілля і Панямоння. Гэты край і сёння прываблівае новыя пакаленні археолагаў, а яго зямля, нягледзячы на даўнюю гісторыю археалагічных раскопак, яшчэ захоўвае багата цікавых артэфактаў, якія чакаюць сваіх першаадкрывальнікаў.

Шэраг дакладаў на секцыі аб гісторыі археалагічнага вывучэння краю прысвячаўся лёсу артэфактаў, якія былі знойдзены ў Беларусі ў XIX і XX стагоддзях, але апынуліся за межамі краіны. Выяўленне такіх экспанатаў яшчэ чакае свайго часу, але спецыялісты адзначаюць, што праца ў гэтым кірунку неабходная, каб аднавіць пласт ведаў аб беларускай археалогіі, атрыманых у выніку ранейшых даследаванняў. Да таго ж, у выпадку выяўлення такіх прадметаў у замежных калекцыях, можа паўстаць пытанне аб іх рэстытуцыі, што значна ўзбагаціла б культурную спадчыну краіны.

У АВАНГАРДЗЕ — МОЛАДЗЬ

Падчас мерапрыемства абмяркоўвалася не толькі гісторыя археалагічнага вывучэння паўночнага захаду Беларусі, але і вынікі апошніх даследаванняў у гэтым рэгіёне, а таксама прапанаваныя паводле іх новыя навуковыя канцэпцыі. Археолагі ў адзін голас падкрэсліваюць, што іх задача не толькі і не столькі пошук знаходак, але, тым не менш, новыя артэфакты таксама пастаянна з'яўляюцца.

Удзельнік аргкамітэта семінара, магістрант Інстытута падрыхтоўкі навуковых кадраў Нацыянальнай акадэміі навук Аляксандр Гаршкоў, які тэўны час удзельнічаў у археалагічным наглядзе і даследаваннях падчас рэканструкцыі Старога замка ў Гродне, адзначае, што там апошнім часам было зроблена шмат цікавых знаходак, якія неўзабаве дазволяць праліць святло на гісторыю гэтай гістарычнай мясціны, і дадуць магчымасць зірнуць на яе пановаму.

Даклады археолагаў на семінары былі прысвечаны не толькі апошнім знаходкам па выніках нядаўніх палявых даследаванняў, але, перадусім, перагляду і новай інтэрпрэтацыі ранейшых артэфактаў у святле новых адкрыццяў. Сучасная сітуацыя такая, што знаходак вельмі шмат, і нават для іх апісання і ўвядзення ў навуковы зварот спатрэбіцца яшчэ багата часу. А новыя інтэрпрэтацыі і канцэпцыі непасрэдна сведчаць аб развіцці навукі. Надаецца ўвага і перагляду ўжо існуючых музейных калекцый археалагічных артэфактаў, што робіцца магчымым па выніках новых палявых даследаванняў у месцы ранейшага выяўлення, і дазваляе аднавіць іх кантэкст, які ў свой час не быў улічаны.

Адметна, што ў секцыі семінара, прысвечанай вынікам апошніх палявых даследаванняў, выступала з дакладамі пераважна моладзь, а гэта таксама сведчыць аб развіцці археалагічнай навукі, захаванні цікавасці да яе, і дае надзею на будучыя поспехі. Маладое пакаленне археолагаў прымяняе класічныя метады працы і найноўшыя веды, атрыманыя ў вышэйшай школе: палявым даследаванням заўжды папярэднічае аналіз пісьмовых і рэчавых крыніц, вывучэнне досведу папярэднікаў.

ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ

Арганізатары семінара адзначаюць вялікую ролю Нацыянальнага гістарычнага музея і яго аддзела археалогіі, які сёння дае даследчыкам пляцоўку для выказвання і дыскусіі, чаго раней так не ставала для абмену досведам. Такая актыўнасць робіць музей яшчэ адным навуковым археалагічным цэнтрам і дае надзею на з'яўленне новай беларускай школы археалогіі.

Мяркуецца, што адзін з чарговых семінараў можа быць прысвечаны археалогіі зоны адчужэння — то-бок, тых мясцін, якія закрытыя для даследаванняў пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС, але шматлікія ранейшыя знаходкі з таго рэгіёна яшчэ патрабуюць вывучэння.

К

Надзея КУДРЭЙКА

Георгій Пятрэнка: “Я іграў самога сябе”

Акцёры Георгій Пятрэнка і Іван Трус у ролях Пранціша Вырвіча і Баўтрамея Лёдніка.

АКЦЁР І ПАМОЧНІК ТЭХНОЛАГА

— Нягледзячы на маладосць, вы ўжо нямала паздымаліся, зараз чакаеце прэм’еру гучнага фільма, у якім сыгралі галоўную ролю… А мы сустракаемся пасля заканчэння вашага працоўнага дня ў фірме, што займаецца фарбамі. Мяне гэты факт крыху дзівіць.

— Я не лічу, што ў нашых умовах гэта нешта надзвычайнае — многія акцёры акрамя тэатра і кіно яшчэ чым-небудзь займаюцца. Нават калі казаць пра фарбу — у “Авантурах...” я здымаўся з артыстам, які фарбуе аўтамабілі. Бо працы ў кіно ў апошнія гады няшмат. Напрыклад, калі толькі пачынаў вучыцца ў Акадэміі — гэта 2011, 2012 гады, здымак было вельмі многа, і нас, студэнтаў, пастаянна куды-небудзь запрашалі на невялічкія ролі. І хаця ў Акадэміі гэта не надта віталася, мой майстар Лідзія Аляксееўна Манакова мяне адпускала: “Ідзі, ідзі, ты ж на платным вучышся, табе трэба плаціць”. У тыя часы я нават адмаўляўся ад прапаноў, бо аддаваў прыярытэт вучобе, хацеў спачатку чамусьці навучыцца і стаць прафесіяналам. І ўсё думаў — вось атрымаю дыплом, і буду здымацца ды здымацца! Але атрымалася так, што беларускага кіно па-ранейшаму мала, а Расія з-за розных фінансавых і валютных крызісаў стала значна меней рабіць у нас фільмаў, і запрашэнні цяпер рэдкія.

— Вы кажаце толькі пра кіно, а ёсць жа і тэатр.

— Па-першае, у мяне не было размеркавання, таму што я вучыўся на платным аддзяленні. Па-другое, у тэатр я свядома не іду па фінансавых прычынах — сам я не з Мінска, а з Маладзечна, і мне акрамя ўсяго трэба і кватэру здымаць: з працай у тэатры на пастаяннай аснове я не выжыву. Але мяне абсалютна не засмучае быць памочнікам тэхнолага, наадварот — я лічу, што трэба ўмець і яшчэ штонебудзь рабіць акрамя акцёрства, бо сёння ты запатрабаваны, а заўтра раптам не. Таму павінны быць план Б, павінна быць яшчэ адна прафесія. Да таго ж у мяне больш-менш вольны графік у гэтай фірме, і я магу, калі трэба, знята ў кіно ці выступіць у лялечным тэатры “Какао”, з якім супрацоўнічаю. Канешне, калі б можна было працаваць у тэатры і жыць на гэта, я быў бы шчаслівы. Але ж мужчына павінны забяспечваць і сябе, і сваю будучую сям’ю.

— У вас жа было ўжо столькі серыялаў, і прафесійнае партфоліа дастаткова вялікае…

— Я і сам часам задумваюся — вось быццам і былі неблагія ролі ў кіно, быццам і не бяздарны... Проста каб пастаянна і многа здымацца, трэба пераязджаць у Расію. У расійскіх серыялах мне ўжо даўно не даводзілася працаваць, затое была даволі вялікая роля ў папулярным украінскім серыяле “Сдается домик у моря”. І наступным будзе менавіта ўкраінскі ваенны серыял — тэлеканал “Інтэр” ізноў жа ў Беларусі здыме другі сезон “Ни шагу назад”. Але ў мяне там толькі пяць здымачных дзён, ды й усе шэсць серый робяцца за месяц! Астатні час трэба ж недзе працаваць, нечым зарабляць.

ПЕРШАЯ ГАЛОЎНАЯ РОЛЯ

— Давайце згадаем той момант, калі вам прапанавалі ролю Пранціша Вырвіча. Як гэта было, што вы адчулі?

— Калі мне прапанавалі паспрабавацца на ролю Пранціша, я, дарэчы, працаваў барыста, варыў каву. А калі вучыўся ў Акадэміі, быў і афіцыянтам (смех). Рэжысёр Аляксандр Анісімаў мяне ўжо ведаў: я здымаўся ў ягонай карціне “Следы на воде”. Канешне, я адразу захапіўся ідэяй: у першую чаргу тым, што гэта наша беларуская карціна, наша беларуская тэма і здымацца будуць толькі беларускія акцёры. І што гэта касцюміраваная гісторыя. Спачатку планаваліся і руская, і беларуская агучкі — з апошняй, наколькі я ведаю, пакуль яшчэ не атрымалася, не хапае сродкаў. І я вельмі хацеў знята ў гэтай ролі! Хаця нас адразу папярэдзілі, што бюджэт невялікі, таму і стаўкі будуць даволі сціплымі. Але ўсе, з кім я стасаваўся, — нават грымёры, касцюмеры — працавалі ў пэўным сэнсе дзеля ідэі, на энтузіязме.

— А вы чыталі толькі сцэнарый ці зацікавіліся і самой кнігай Людмілы Рублеўскай?

— Спачатку прачытаў сцэнарый, а потым і кнігу. Я лічу, што мне вельмі пашанцавала, бо рыхтавацца па кнізе значна прасцей — усё падрабязна прапісана, уся роля распрацавана, так бы мовіць. І мы многа размаўлялі з Людмілай Рублеўскай. Яна, дарэчы, лічыла, што я вельмі падыходжу на Пранціша, ды я і сам адчуваў, што гэта проста “маё”, бо супадаю з персанажам працэнтаў, мабыць, на 97. Можна нават сказаць, іграю сам сябе. Што мяне зачапіла — Пранціш заступаецца за людзей, змагаецца за справядлівасць, і ў мяне таксама абвостранавае пачуццё справядлівасці — нават калі ведаю, што раблю сабе горш, не магу ўстрымацца і “іду ў бой”. Тым не менш, я многа рыхтаваўся: напрыклад, чытаў кнігу, рабіў сабе пазнакі, і тэлефанаваў Людміле з пытаннямі. І з Іванам Трусам, які іграў Баўтрамея Лёдніка, мы падоўгу разбіралі нашы сцэны — увогуле добра папрацавалі разам, былі проста на адной хвалі, хаця раней не ведалі адзін аднаго.

— Я бачу, што вы вельмі адказна падышлі да справы, з душой.

— Так, я паставіўся вельмі сур’ёзна. Па-першае, гэта ж мая першая галоўная роля ў поўнаметражным фільме. Па-другое, мне цікава так рыхтавацца. Як казаў у Акадэміі наш майстар Сяргей Мікалаевіч Тарасюк, калі мы доўга-доўга і дэталёва працавалі над дыпломным спектаклем: “Цаніце гэты час, таму што больш нідзе, як у Акадэміі, вы не зможаце столькі працаваць над роллю — ні ў тэатры, ні тым больш у кіно!” А я ў прынцыпе калі што раблю, то раблю гэта дбайна і педантычна. І я шчыра быў захоплены працэсам, настолькі, што не мог прыпыніцца, і проста ўвесь час думаў пра свайго персанажа.

> *“Мы столькі бачылі гістарычных фільмаў пра Расію, пра Амерыку, Англію ці Францыю, а ў нас саміх столькі цікавага!*

ЧАМУ НЕ ПІШУЦЬ ТАКІЯ СЦЭНАРЫІ?

— А ці даведаліся вы нешта новае для сябе падчас працы над фільмам з пункту гледжання гісторыі? Я думаю, для многіх гледачоў увогуле будзе адкрыццём, што ў нашай гісторыі было месца для падобных сюжэтаў, што былі ў нас такія людзі, такія героі.

— Справа ў тым, што адным з маіх самых любімых прадметаў у школе была гісторыя — я вельмі ўдзячны свайму настаўніку Уладзіміру Міхайлавічу Філіповічу. Канешне, я многага не ведаў, але калі размаўляў з Людмілай Рублеўскай, у памяці нешта ўспліывала, і я па меншай меры разумеў, пра што гаворка. Я ж і кажу — што мяне найбольш зачапіла ў сцэнарыі і ў фільме: наш беларускі сюжэт. Мы столькі бачылі гістарычных фільмаў пра Расію, пра Амерыку, Англію ці Францыю, а ў нас саміх столькі цікавага! І калі б нам даць такія бюджэты, як у тым жа Галівудзе ці хаця б у Расіі, мы маглі б зняць многа захапляльнага кіно па нашых беларускіх гістарычных сюжэтах. Насамрэч, я патрыёт, і яшчэ падчас вучобы ў Акадэміі неаднойчы задаваўся гэтым пытаннем — чаму не здымаюць, чаму не пішуць такія сцэнарыі?

— Ці бачылі вы ўжо фільм цалкам? Што можаце сказаць пра яго?

— Я пакуль бачыў толькі папярэдні мантаж, без агучкі і іншых тэхнічных момантаў. І перакананўся, што гэта ўжо няблага. Я разумею, што ёсць нейкія нюансы, якія можна было б дапрацаваць пры наяўнасці сродкаў і часу, але мы зрабілі ўсё, што маглі. У фільме падабраліся выдатныя акцёры, выдатныя мастакі, касцюмеры, дэкаратары — усе-усе. Гэта ні ў якім разе не сумная карціна: канешне, там ёсць і каханне, але ёсць і захапляльная гісторыя, містыка, рэальныя гістарычныя персанажы кшталту Радзівіла. Вельмі падрабязна расказваць не буду, каб не спойлерыць, — лепей паглядзець самім, рэкамендую шчыра. Не абяцаю, што пасля кіно гледачы выйдуць нейкімі агаломшанымі ці ў іх зменіцца светапогляд. Але я, калі б нават і не меў дачынення да гэтага фільма, як просты глядач абавязкова схадзіў бы — хаця б таму, што раней нічога падобнага ў нас не здымалася, і гэта пра нашу беларускую гісторыю. Вось як, напрыклад, я вельмі чакаю фільма “Купала” — сам там не здымаўся, але мне вельмі-вельмі цікава.

— Як думаеце, ці прачнецеся нараніцу знакамітым, ці пачнуць вас пазнаваць на вуліцах?

— Я не настройваю сябе на гэта, ды й не думаю, што пасля “Авантур” мяне адразу пачнуць запрашаць у вялікае кіно. Ці пазнаваць на вуліцах — хаця б таму, што ў жыцці я трохі адрозніваюся ад сваіх кінароляў. Але я па меншай меры ведаю, што і рыхтаваўся, і працаваў з усіх сіл, і мне не будзе сорамна за маю працу, а гэта галоўнае.

ДЗЯКУЙ МАМЕ

— А вы заўсёды марылі стаць акцёрам, як вы прыйшлі ў гэтую прафесію?

— Мне яшчэ ў школе ўсе казалі, што я прыроджаны артыст. Але ж я чамусьці лічыў, што на акцёраў у Беларусі не вучаць і трэба ехаць, напрыклад, у Маскву, а гэта было б даволі складана. І тут бабуля кажа, што ў яе ёсць добры знаёмы — акцёр і педагог Фама Сільвестравіч Варанецкі, давай да яго з’ездзім. Аказваецца, і ў Мінску вучаць! Да экзаменаў засталося пару месяцаў, і на падрыхтоўку было зусім няшмат часу — але я нечакана паступіў. Паступіў, дарэчы, з вельмі добрымі баламі, і ўсё ж трапіў толькі на платнае аддзяленне. Таму вырашыў ісці ў які іншы інстытут, бо не хацеў, каб мама за мяне плаціла — у нас не тая была сітуацыя. А вучыцца і працаваць недзе па начах — то што гэта за вучоба? Аднак мама мела іншае меркаванне (смех). Яна ў мяне такая рашучая: “Не, ты пойдзеш вучыцца туды, куды хочаш!” Пагаварыла з дзядзькам, і два першых курсы яны мне дапамагалі фінансава, а з трэцяга я ўжо сам плаціў, бо пачаў здымацца. Мама ў мяне ўвогуле малайчына — і прыгажуня сапраўдная, у нас з ёй вельмі добрыя адносіны, яна мяне заўсёды падтрымлівае.

— Для вас праца над фільмам скончылася і тым, што вы сталі жанікам — не ў кіно, а ў жыцці. Што гэта за гісторыя?

— У самы апошні здымачны дзень я зрабіў прапанову рукі і сэрца сваёй каханай. Дзяўчынкі ж любяць, каб усё было прыгожа і рамантычна, — і вось на “Авантурах Пранціша Вырвіча”, у цікавым антуражы і ў гістарычных касцюмах так і атрымалася. Каця таксама актрыса, але ў гэтым фільме не здымалася. Я склаў хітры план, дамовіўся з калегамі і завабіў яе на пляцоўку, касцюмеры дапамаглі прыдумаць гісторыю, чаму трэба апрануць прыгожую старадаўнюю сукенку... І сюрпрыз насамрэч атрымаўся. Вяселле сыграем, думаю, летам.

Фота Ганны БАРАЗНЫ.

Не фільм, а жыццё — прапанова рукі і сэрца.

У Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі працуе выстава Вольгі Сазыкінай, якая мае назву “Пра шкло”. Тут можна яшчэ дадаць: “пра прыроду мастацтва”, “сваю прастору”, “спосаб разумення сябе і свету”. Аўтар графічных і жывапісных твораў, цікавых і значных праектаў з ручной паперай, інсталяцыяй, відэаартам Вольга Сазыкіна менавіта шкло называе “матчынай мовай” у перадачы сваіх ідэй. Роднай мовай, як вядома, валодаюць дасканала, на ёй дзеляцца самым важным і патаемным.

Вібрацыі, якія адчуваем паўсюль

Філасофія празрыстасці Вольгі Сазыкінай

На першым паверсе музея ў шкляных вітрынах дэманструюцца серыі работ, зробленых падчас творчых семінараў на шклозаводзе “Нёман”, у кафэ — празрыстае шкло як карціна і прыдатная аснова для пясчаных знакаў ды малюнкаў. Пра апошнія праекты, галоўнае ў творчасці і ўласцівасці любімага матэрыялу распавяла Вольга Сазыкіна.

— Ці ёсць для вас у творчасці нешта больш важнае за астатняе?

— Самае важнае для мяне — гэта ідэя, якая натхняе, маё асабістае пасланне, скіраванае да свету. Для яго ўжо падбіраецца матэрыял, які можа быць абсалютна любым. Так, вельмі лёгкі, красамоўны і візуальна-ёмісты — відэаарт. І вельмі цяжкі, не толькі па сваёй фізічнай якасці, але і па даступнасці. Так, гэта — шкло, а для працы з ім патрэбны заводы і печы. Але шкло для мяне, як матчына мова. У першую чаргу таму, што я скончыла аддзяленне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва па спецыяльнасці “шкло” Беларускай акадэміі мастацтваў, потым дзесяць гадоў працавала на шклозаводзе “Нёман”. І нават калі адтуль сышла, атрымлівалася час ад часу вяртацца, каб рэалізоўваць свае ідэі. Нямала адпрацавала і на Камбінаце дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Саюза мастакоў Беларусі, рабіла вітражы і невялікія скульптуры са шкла.

МАСТАЦТВА ДЛЯ ВЫТВОРЧАСЦІ

— Шкло — адзін з самых прыгожых матэрыялаў, але з-за сваёй распаўсюджанасці ў побытавым жыцці, ён часта ўспрымаецца вельмі ўтылітарна. І на шклозаводзе вам трэба было працаваць на вытворчасць, распрацоўваць посуд. Як такая прыкладная задача ўплывала на творчасць?

— На нашай спецыяльнасці рыхтуюць мастакоў па шклу менавіта для вытворчасці. Выпускнікі акадэміі ідуць працаваць на шклозаводы, і, як дызайнеры, распрацоўваюць заводскую прадукцыю, гатункавы посуд. У мой час была такая пітная лінейка: 50, 75 і 125 кубкаў, селядцоўня, ваза для садавіны і печыва, попельніца. Нам, мастакам, трэба было зрабіць 30 узораў посуду за месяц. Пры гэтым, магчымасці вытворчасці былі вельмі сціплымі, і ўносіць змены ў паток было вельмі складана. Прымалі і выраблялі на прадпрыемстве адну — дзве рэчы, астатняе мы рабілі “ў стол”. Па гэтай прычыне ў нашых шклозаводаў такі лёс, хаця працавалі на іх магутныя дынастыі, ад прадзедаў майстэрства перадавалася з пакалення ў пакаленне.

— За час працы на шклозаводзе “Нёман” вы распрацавалі некалькі ўласных тэхналогій.

—Так, у той час мы, мастакі, мелі творчы дзень, на працягу якога, акрамя заводскай прадукцыі, маглі рабіць мастацкія творы, з якімі потым удзельнічалі ў выставах і ўступалі ў Саюз мастакоў. Такія нашы дэкаратыўныя выказванні ўжо можна было назваць мастацтвам. Прыдумлялі мы і новыя тэхналогіі для ўпрыгожвання шкла. Я распрацавала тэхналогію “шклотканіна” і “прыродныя матэрыялы”, для апошняй выкарыстала расліны, якія згаралі пад высокай тэмпературай у шкле, але пакідалі адбітак, падобны да гравіроўкі. Была ў мяне яшчэ распрацоўка з адметным па саставе металам, які даваў бурбалкі. Я нават маю сярэбраны медаль ВДНГ за фактуру на шкле. Асобныя з гэтых выраба ў патрапілі ў музеі ці былі закуплены, але мне заўсёды цікава рабіць нешта новае. У шклоўшчыка такі лёс — калі ён застаецца мастаком, то пачынае шукаць сябе і ў іншых галінах. Натуральна, я звярнулася да графікі, жывапісу, потым мяне зацікавіла актуальнае мастацтва і аб’екты, з’явілася ручная папера, потым было крыху лямцу, на пэўным этапе займалася відэаартам. А зараз зноў вярнулася да шкла. Рэалізаваць свае новыя ідэі атрымалася дзякуючы двум семінарам, якія прайшлі на базе шклозавода “Нёман”. Першы пяць гадоў таму зладзіла Алена Атрашкевіч, а другі скончыўся чатыры месяцы таму, яго рабіла Ірына Кузняцова.

ДЫЯЛОГ МАТЭРЫЯЛАЎ

— Ці адбылося за час працы з іншымі матэрыяламі перасэнсаванне магчымасцяў шкла і вашага ўласнага бачання гэтага матэрыялу?

— Вядома, зараз я крыху па-іншаму ўяўляю сабе шкло. Так, у мяне з’явіліся праекты з кансервавымі слоікамі. Паколькі фармавой гаспадаркі на “Нёмане” як такой ужо няма, а шкло трэба ў нешта ўдзімаць, каб стварыць форму, бо інакш будзе проста бурбалка, я пачала выкарыстоўваць для гэтага кансервавыя слоікі і будаўнічыя сеткі. Пад сваю задуму я падганяла іх па форме і памеры, выразала патрэбныя дзіркі. Сёння мне ўяўляецца гэта больш актуальным за тое, што мы рабілі раней: прыдумлялі прыгожыя рэчы, стылізавалі іх і інтэрпрэтавалі як сапраўднае дэкаратыўнае мастацтва. Праз матэрыял, які вельмі добра ведаю, сёння я выказваюся. Так у мяне з’явіліся кветачкі-галюцынагены, што растуць з кансервавых слоікаў, дарэчы, вельмі прыгожых, стальнога паленага колеру. Пасля апошняга семінара з’явіўся “Іншаземны дэсант”, які называюць і пацучкамі, і камарамі, як заўгодна.

— Вельмі прыгожыя праекты і з будаўнічай сеткай, якая ўспрымаецца такой своеасаблівай графікай на шкле.

— Так, у мінулы раз на заводзе была зроблена “Партызанская архітэктура” — гэта такія надзьмутыя бутэлькі з выпуклымі бурбалкамі. Чаму менавіта партызанская? У Еўропе існуе цікавая тэндэнцыя ў архітэктуры, калі ўладальнікі дамоў прыдумляюць дадатковыя балконы, прыбудоўваюць да сваіх кватэр мосцікі на суседняе дрэва і робяць там гняздо, ці маленькі домік. Ствараюць такія вось вельмі дзіўныя рэчы.

— Непасрэдна працы на шклозаводзе папярэднічаў і не менш складаны перыяд асэнсавання, абдумвання ідэі?

— У мастацтве — галоўная метафара. Калі ты выношваеш сваю ідэю, вядома, улічваеш уласцівасці матэрыялу, з якім працуеш сам, і з якім ён будзе ўзаемадзейнічаць. Дыялог матэрыялаў для мяне павінны будавацца на кантрасце. На выставе ёсць серыя работ “Забароненае жаданне”, для ўвасаблення метафары ў шкляныя бурбалкі я змясціла камяні. Гэты прыём ішоў ад майго разумення каменя як жывога арганізма, блізкага будысцкай канцэпцыі адухоўленасці свету. Мне здаецца, што ў каменя ёсць душа, я іх збіраю, прывожу адсюль, дзе бываю, — у маёй калекцыі камяні з трох акіянаў і пяці мораў. Апошні прывезла з Ужгарада, берага ракі Уж. Кожны па-рознаму сябе паводзіць у шкле: адны камяні трэскаюцца, іншыя прымаюць гарачыню шкла і зліваюцца з ім арганічна.

— У творах на выставе адкуль камяні?

— Там ёсць чорны камень з белымі крапінкамі, які называецца “карадаг”, з яго, дарэчы, яшчэ робяць прыгожыя пярсцёнкі. Некалькі камянёў з Чорнага мора. Гэты праект я б з задавальненнем паўтарыла, бо толькі пачала яго распрацоўваць, таму нешта атрымалася, а нешта — не. У экспазіцыі ў музеі тое, што паспела зрабіць — сем празрыстых пасудзін, унутры якіх камяні.

ПАВЕТРА І ШКЛО

— На выставе я захацела паказаць і сваю незаслужана забытую канцэптуальную работу 1980-х гадоў, якая называецца “Уздых”. Каб яе зрабіць, трэба ўдыхнуць і выдыхнуць. Таму яна выглядае як бурбалка, злоўленая на далонь, і мае адбіты край — гэта такі пупочак, як у жывым арганізме. Упершыню я выставіла свой “Уздых” на міжнароднай мастацкай радзе ў Эстоніі. Работа выклікала шмат абмеркаванняў: з аднаго боку, гэта яскравая метафара, а з другога — не ўсе майстры мінулага пакалення гатовыя былі прымаць такое лёгкае выказванне. Яны казалі: “Хто так працуе са шклом? Дзе тут кроў, пот і слёзы? Дзе пескаструменка? Трэба і гэтае дарабіць, і тое”. Але ў той час я ўспрымала сваю работу як акцыю, перформанс. Мінула шмат гадоў, а ідэя жыве — далонь можа быць рукой Бога, а бурбалка — жыццём. Гэтую работу я хачу падарыць музею.

— Я зараз узгадала некалькі вашых праектаў, якія тым ці іншым чынам звязаны з дыханнем, і, у першую чаргу, графічную серыю “Дзённік дыхання”. І ўсе яны толькі дапаўняюць адзін аднаго.

— Ведаеце, я нарадзілася пад знакам Блізнятаў. Думаю, што момант нараджэння вельмі важны, бо чалавек як мікракосмас звязаны з Сусветам. А для Блізнятаў самае галоўнае — гэта паветра. Я адчуваю сваю прыроду, таму і мае праекты — гэта мая стыхія, а не прыдуманы ход.

Мы працуем з метафарамі, і чым яна больш ёмістая ў сваёй сувязі з матэрыялам, тым больш у яе варыянтаў прачытання, і больш людзей могуць убачыць у ёй нешта сваё. Мне блізкая не толькі псіхалогія, яшчэ філасофія, ізатэрыка, гэта так цікава — перапрацоўваць веды, а потым адлюстроўваць ва ўласным выказванні.

— Пасланне, якое ўтрымлівае ваша серыя шкляных карцін, таксама напоўнена ветрам, а яшчэ зыбкім пяском.

— Гэты праект узнік спантанна. У кафэ музея, дзе я яго дэманструю, звычайна вывешваюць жывапіс і графіку. І мне прыйшла думка, чаму б не зрабіць карціны са шкла. Я пачала эксперыментаваць з рознымі матэрыяламі, і ўсё не атрымлівалася, пакуль не узгадала пра пясок. Дарэчы, з пяску, а яшчэ соды і мелу складаецца і само шкло, у сплаве пры тэмпературы 1500 градусаў яны даюць празрыстасць. Пясок таксама не адразу даваўся, пакуль не знайшоўся прыём — я расчэсвала яго грэбнем, звяртаючыся да асацыятыўнага шэрагу пясчаных дзюнаў і японскіх садоў. На мове фармальнай кампазіцыі гэта рытмы, а ў жыцці тыя вібрацыі, якія мы адчуваем паўсюль, гэта ўдых і выдых, адлівы і прылівы, змена пораў года — такі сусветны сардэчны рытм, я яго яшчэ называю “біццё сэрца планеты”. У гэтай серыі ёсць дзве працы, прысвечаныя кітайскай “Кнізе перамен”. Каб прадказаць будучыню на пяску палачкай ці пальцам людзі малявалі палоскі, кожны варыянт мае сваё тлумачэнне. Падчас працы над праектам я рабіла гэта спантанна, але потым пацікавілася, што ж азначаюць мае малюнкі: адзін быў шчасце, а другі — удача. Вось так з’явіўся ў творчасці пясок. І сёння, калі ў майстэрні я прычэсвала гэты пясок, сыпала яго на шкляную паверхню, змахвала пэндзлікам і зноў сыпала, то адчула, што ўжо знаходжуся ў нейкім паралельным вымярэнні, нават адчула сваю ўнутраную прыроду. У гэтым ёсць пэўная форма постшаманізму — трапятанне перад флорай і фаўнай зямлі, разуменне мовы прыроды і камунікацыя з ёй, прадчуванне таго, што прырода хоча табе сказаць.

Творы з музейнай экспазіцыі.

Іна НАРКЕВІЧ, арт-журналіст
Фота Наталлі ОВАД
І Сергея ЖДАНОВІЧА

КУЛЬТУРА
WWW.KIMPRESS.BY
№ 11 / 14 САКАВІКА 2020 г.

Спакой і гармонія, якіх нам не стае

Яшчэ некалькі стагоддзяў таму ў мастацтве жывапісу склалася субардынацыя жанраў. На ўзроўні падсвядомасці грамады яна існуе і сёння. У ёй крытэрый значнасці — прафесіяналізм. Лічыцца, што шматфігурную кампазицыю намаляваць куды цяжэй, чым партрэт ці нацюрморт. Адпаведна, вышэйшая праява майстэрства — гэта нібыта батальны жанр, прыступку ніжэй займае сюжэтны жывапіс. Краявід жа знаходзіцца ближэй да падмурка піраміды. Пры гэтым ён быў і застаецца, бадай, самым дэмакратычным жанрам. Не кожнаму інтэр'еру пасуе сюжэтнае палатно, парадны партрэт ці ню. А выява краявіду робіць утульным і палац, і офіс, і жытло паспалітага чалавека.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Зноў жа лепей быць выдатным пейзажыстам, чым абы якім баталістам. Прынамсі, славу беларускаму жывапісу ў мінулым стагоддзі прынеслі менавіта два геніяльныя майстры краявіду — Вітольд Бялыніцкі-Біруля і Віталь Цвірка. А тое, які моцны эмацыйны імпульс можа атрымаць глядач ад па-майстэрску намаляванага краявіду, я не аднойчы адчуваў і на выставах, і ў майстэрнях мастакоў. Вось і зараз цудоўнымі ўражаннямі запомнілася мне персанальная выстава мастака з Навагрудка Кастуся Качана, прымеркаваная да 70-годдзя творцы.

Нарадзіўся спадар Кастусь у вёсцы Лаўрышава, што на Навагрудчыне. У дваццаць пяць гадоў меў вышэйшую адукацыю, ніякім чынам не звязаную з мастацтвам — Фізічны факультэт БДУ. Працуючы па атрыманай спецыяльнасці, тры гады як вольны слухач наведваў Тэатральна-мастацкі інстытут. Далей быў удзел у выставах, членства ў Беларускім саюзе мастакоў, узнагароды БСМ і Міністэрства культуры. Шэсць гадоў таму стварыў у Навагрудку прыватную мастацкую галерэю. Для характарыстыкі такіх асоб звычайны папулярны англамоўны выраз "self made man" — чалавек, які стварыў сябе сам.

На замчышчы.

Тое, што творца, які не мае ганаровых званняў і ўрадавых узгарод, ладзіць персаналію ў сценах галоўнай мастацкай скарбніцы краіны ўжо само сабой рэч незвычайная. Такі гонар надаецца толькі тым, хто і пры адсутнасці афіцыйных атрыбутаў высокага статусу валодае высокім аўтарытэтам у прафесійных і калямастацкіх колах. Гэта якраз пра Кастуся Качана. Як і належыць носьбіту сапраўднага таленту, ён чалавек сціплы. Ды і творчасць ягоная вонкава не кідкая. У карцінах спадара Кастуся няма нічога такога, што б здалёк кідалася ў вочы. Але калі спыніўся каля ягоных краявідаў, дык доўга не адыходзіш. Спадар Кастусь занатоўвае малавядомы жыхарам мегаполісаў і буйных гарадоў свет беларускіх вёсак і мястэчак. Інакш кажучы, малюе "глыбінку". Я свядома бяру гэта слова ў двукоссі, бо "глыбінка" ці "сталіца", на маю думку, гэта толькі розныя дэкарацыі адной і той жа п'есы — бо паўсюдна ў людзей адны і тыя ж клопаты і праблемы, радасць і смутак.

Стары гасцінец.

Апошні шлях хрысціяніна.

Асабіста я пазнаёміўся з беларускай "глыбінкай" дзякуючы сваёй прафесіі. Як журналісту, мне пашчасціла наведваць мясціны, куды выправіцца самахоць неяк не выпадала. І часу на тое не стае, і больш пільныя справы трымаюць. А галоўнае, калі нейкая цікавостка, лічы, побач — на адлегласці якіх-небудзь 50 — 100 кіламетраў, дык здаецца, заўжды паспею... Адзначу, што маё ўспрыманне Навагрудка, Міра ці Вішнева з бачаннем спадара Кастуся калі і супадае, дык толькі часткова. Па маіх назіраннях, беларускія мястэчкі — гэта добраўпарадкаваныя паселішчы з наяўнасцю ўсіх чыннікаў сучаснай цывілізацыі.

А на карцінах спадара Кастуся час нібы спыніўся. Драўляныя дамкі на бераегах невялікіх рачулак, вузкія вулкі, перспектыва якіх упіраецца ў касцёл. Так магла выглядаць наша зямля два — тры стагоддзі таму, пры тым, што ўсё гэта намалявана з натуры. Мастак пакідае па-за сваёй увагаю адметныя рысы сучаснасці. Рэдка-рэдка на ягоных палотнах з'явіцца сілуэт самахода, ды і то на візуальнай перыферыі. Тое, што на палатне дзень сённяшні, іншы раз сведчыць хіба нейкая дэталь кшталту формы дзіцячага вазка. Такое лецішча, такі ракурс для творцы не можа быць выпадковым.

Мяркую, што Кастусь Качан паставіў сабе за мэту занатаваць рэшткі "Беларускай Атлантыды" — Вялікага Княства і Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў, што адышлі ў гістарычны нябыт, але жывуць у нашай падсвядомасці. Мастак малюе пейзажы заходняй часткі нашага краю, дзе з пэўных гістарычных прычын знакаў згаданай эпохі засталося болей, чым на ўсходзе Беларусі. Мастак знаходзіць у гэтых рэаліях спакой і гармонію, якіх усім нам часам не стае.

К

Альгіс Грышкявічус — пра палёты, сон, рэчаіснасць

Маштабная выстава Альгіса Грышкявічуса "Паралельныя ўяўленні" адкрылася ў сталічнай галерэі сучаснага мастацтва па Кастрычніцкай. Гісторыю мастак распавядае беларускаму гледачу парадаксальную, зрэшты, магчымую ў марах. Але навошта чакаць выканання мары, калі ўсё можна зрабіць ужо зараз?

Па словах Мінданўгаса Габрэнаса, аташэ па культуры Пасольства Літоўскай Рэспублікі ў Беларусі, выстава Грышкявічуса ў Мінску — спрэчнае прадпрыемства. Мастак працуе ў складаным сінтэтычным жанры, яго працы прызнаныя на музейным узроўні, але ў галерэі і ў гэткай колькасці могуць быць успрынятыя неадназначна. Акрамя таго, мінская публіка знаёмая з зусім іншай літоўскай фатаграфічнай традыцыяй, а фатаграфіі складаюць асноўную частку экспазіцыі. Іншымі словамі, візуальныя доследы Грышкявічуса знаходзяцца ў прынцыпова іншай плоскасці, чым заслужаная "літоўская школа", з фокусам на штодзённасць і "простых людзей Літвы". Тут жа мы бачым мудрагелістыя сюжэты, дзіўных герояў...

Той, хто нясе.

Прадстаўленне з нябесным роварам.

Дзяўчынка з каменем.

"Паралельныя ўяўленні" прысвечаны перформансам, якія разыгрываюцца групай непрафесійных акцёраў. Адбываецца гэта даволі камічна, аднак ёсць у іх малазразумелых дзеянняў натхняльная тэма, што ператварае перформансы амаль ужо ў тэатр. І тэма гэтая — "Першы літоўскі касманаўт". У Грышкявічуса атрымоўваецца злучыць прыроднае асяроддзе і спробы чалавека ўзляцець, накшталт здымак першых дырыжаблёў ці планёраў канца XIX стагоддзя; а ў калажах ён аб'ядноўвае цялесне ў чалавеку з натуралістычнасцю невядомых істот. Але адсылка да вобраза героя, да агульначалавечай мары аб палёце, вяртае гледача ў поле класічнага мастацтва — і гэта сапраўды нечакана. Тым больш, што герої — звычайныя дзядзькі сярэдніх гадоў — далёкія ад антычных, ды і проста атлетычных мадэляў.

Не толькі фатаграфіі, але відэа і жывапіс прадстаўлены ў праекце: Грышкявічус пачынаў кар'еру як мастак. Лагічным завяршэннем яго касмічнай фантазіі можна назваць аб'екты: нешта падобнае правобразам лятальных апаратаў, толькі зробленыя яны з драўляных дубцоў. З імі, вядома, асобная праца: дрэва асаблівым чынам апрацоўваюць, і выраб аб'екта — працэс доўгі і практычна медытатыўны. Тым не менш, самі канструкцыі настолькі ўдалыя, што іх металічныя копіі ўсталяваны ў грамадскіх прасторах Вільнюса. Ці гэта не поспех сюррэалізму? Але вернемся да фатаграфіі.

Традыцыя "пошуку формы" ў фатаграфіі мае глыбокія карані, але яна заўсёды была ў баку ад мэйнстрыму — усё ж такі фатаграфічны мельум цэняць за іншыя вартасці. Флорыс Нойзюс, Махой Надзь са сваімі фотаскульптурамі, і, вядома, заснавальнік сюррэалістычнай фатаграфіі Ман Рэй займаюць годнае месца ў гісторыі мастацтва. Але цікавасць да іх час ад часу ўспыхвае і згасае, а вось дакументальная дакладнасць, вастрыня жанравага кантэксту і паглыбленне ў псіхалагічны малюнак запатрабаваныя заўсёды. Гэта свайго роду два полюсы, ці дзве чашы вагаў, на якіх баланс або перавагу ўтвараюць асобы аўтараў у кантэксце свайго часу. У 1970 — 1980-я гады серыя ўсесаюзных выстаў "Фотаграфіка" паказала, як савецкія фатографы шукаюць выхады з дакументальнай дакладнасці, але былі яны, у асноўным, аматарамі. Больш блізкім і зразумелым быў іншы вектар: той, што прыняла літоўская школа на чале з Антанасам Суткусам. У наступныя дзесяцігоддзі, намаганнямі заслужанага дзеяча культуры Юрыя Васільева і галерэі "Свет фота", беларуская публіка пазнаёмілася з творчасцю Рамуальдаса Пажэрскіса, Аляксандраса Мацьяўсказа, Рамуальдаса Ракаўскаса ды іншых. Вынаходствы жа сюррэалістаў па-ранейшаму заставаліся ў ценю гэтага працэсу. І толькі ў 2014-м годзе, у галерэі Міхаіла Савіцкага, у Мінску, можна было ўпершыню ўбачыць дзіўныя працы Альгіса Грышкявічуса. Дарэчы, тая выстава "Літоўская фатаграфія праз пакаленні" праводзілася ў рамках II Мінскага фестывалю фатаграфіі, які незаслужана забыты пасля поспеху Месяца фатаграфіі ў Мінску. Аўтар назваў серыю "Цуды ў Мікалішкес": менавіта ў гэтым мястэчку Альгіс з сябрамі Мікаласам і Раймундасам складае свае касмічныя трагікамедыі, смяецца з культа спартыўнага цела, дадае паганства ў сон і яву, а абсурд размяшчае ў мізансцэнах звыклага сельскага жыцця.

У Беларусі ў блізкім ключы Андрэй Шчукін зняў Endemiki і больш пафасны Orbis Tertius (Трэці свет), збольшага "Кінэстэтыку" і "Табу №" — усё гэта сюррэалістычныя пошукі, таксама пастяховыя ў вядомага беларускага фатографа. У Літве ж крытыкі (Маргарыта Матуля, 2009) адзначаюць творчасць Грышкявічуса як "арыгінальны жывапіс чальца Саюза фотамастакоў Літвы", чый поспех "у аўтарытэтных выставачных залах (напрыклад, у Цэнтры Пампіду (Парыж) пацвярджае сілу сінтэзу мастацтваў".

Любоў ГАЎРЫЛЮК,
арт-журналіст

Заключны канцэрт фестывалю "Струны Сібіры". На сцэне — аркестр казахскіх народных інструментаў імя Таціямбета і Нацыянальны акадэмічны народны аркестр Беларусі імя І. Жыновіча пад кіраўніцтвам Міхаіла Казінца. Саліст — Аляксандр Рыцікаў.

Аркестр тваёй краіны

Некалькі дзён таму Нацыянальны акадэмічны народны аркестр Беларусі імя І. Жыновіча на чале са сваім бяззменным мастацкім кіраўніком Міхаілам Казінцом ажыццявіў найцікавы ваяж у далёкі снежны Навасібірск, дзе адбыўся IV Міжнародны фестываль аркестраў народных інструментаў "Струны Сібіры".

Саліруе заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Аляксандр Крамко.

Салісткі аркестра Марта Галубко (злева) і Аксана Хахол.

Беларускі калектыў упершыню прымаў удзел у гэтым грандыёзным форуме з кідкім слоганам "Пашыраючы межы". І сапраўды, сёлетні фестываль, які папярэдне меў рэгіянальныя рамкі, значна пашырыў сваю геаграфію і стаў міжнародным. У Навасібірск з'ехаліся шэсць калектываў з разнастайнымі нацыянальнымі колерамі і традыцыямі. Апроч майстравітых і імянітых аркестраў рускіх народных інструментаў з Навасібірска, Барнаула і Краснаярска сваё майстэрства дэманстравалі Акадэмічны аркестр казахскіх народных інструментаў імя Таціямбета з Караганды і Тувінскі нацыянальны аркестр, які рэгіянальна адносіцца да Сібірскай федэральнай акругі і прадстаўляе мастацтва старадаўняга паўночнага народа Тувы.

Аркестр імя І. Жыновіча з Беларусі на фестывалі быў, бадай, самым чаканым госцем. Яго прыезд утойваў асаблівую інтрыгу, бо беларускія цымбалы па сваіх канструктыўных асаблівасцях вельмі адрозніваюцца ад рускіх домр і балалаек, казахскіх кабызаў ці тувінскай чанзы. Шматструнныя беларускія цымбалы сёння — гэта высокатэхналагічны музычны інструмент з неабмежаванымі выканальніцкімі магчымасцямі, але ў Расіі яго амаль не ведаюць. Таму аркестру імя І. Жыновіча трэба было паказаць інструментальны голас Беларусі па максімуму. Складаючы праграмы, Міхаіл Казінец зрабіў акцэнт выключна на інструментальных творах, што выяўлялі б майстэрства салістаў-цымбалістаў аркестра. Сярод іх — заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Ларыса Рыдлеўская, лаўрэаты міжнародных конкурсаў Аксана Хахол, Алена Касціцына, Марта Галубко і Ганна Лоб. Вялікая ўвага была нададзена творам для фальклорных духавых інструментаў у выкананні заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь Аляксандра Крамко і яго вучня — лаўрэата міжнародных конкурсаў Аляксандра Рыцікава. Праграма таксама дала магчымасць пазнаёміць гасцей і ўдзельнікаў фестывалю з майстэрствам выдатнага баяніста аркестра, лаўрэата шматлікіх міжнародных конкурсаў Дзяніса Чорнага. Яна ўключала ў сябе вялікі панарамны зрэз сучаснай рэпертуарнай палітры аркестра імя І. Жыновіча. У яе ўвайшлі адметныя творы беларускіх кампазітараў Валерыя Іванова, Аляксандра Крамко, Уладзіміра Кур'яна, Віктара Малых, а таксама музыка Георгія Свірыдава, Ігара Карнелюка, Рышара Гальяна, Карла Джэнкінса і Кансуэлы Веласкес. Рэпертуар, як кажуць, на любы густ.

Выступленне аркестра імя І. Жыновіча зрабіла сапраўдны фурор.

— У суквецці розных аркестраў наш калектыў здолеў паказаць менавіта сваё, асаблівае гучанне, — гаворыць народны артыст Беларусі Міхаіл Казінец. — Тэмбры беларускіх цымбал, а таксама дудачкі, жалейкі, акарыны, дуды былі адкрыццём для тамтэйшай публікі. Ведаеце, я не схільны перахваляць свой калектыў, гэта мне ніколі не ўласціва. Але павінен сказаць, што гэта было сапраўды трыумфальнае выступленне аркестра перад слухачамі Навасібірска. Кожны нумар сустракаўся шквалам апладысментаў. Калі аркестр іграў, у выдатнай тысячнай зале Навасібірскай філармоніі імя Арнольда Каца была такая цішыня! Я адчуваў, з якой увагай і здзіўленнем нас слухалі, і як зала літаральна лавіла кожны гук! Для нас гэта паездка была гістарычнай. Мы вельмі ўдзячны арганізатарам фестывалю "Струны Сібіры" за тое, што яны знайшлі сродкі, каб прыняць аркестр Жыновіча, абкружыць нас усіх клопатам і цеплынёй і зрабіць сапраўднае свята!

Паездка ў Навасібірск для Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Беларусі імя І. Жыновіча стала выдатным пачынам у юбілейны сезон. Бо ў снежні 2020 года калектыў будзе святкаваць сваё 90-годдзе! Удзел у міжнародным фестывалі "Струны Сібіры" падмацаваў высокі ўзровень прафесійнага майстэрства музыкантаў і даў магутны стымул для далейшай працы. Бо 2020 год для "жыновічаўцаў" абяцае быць гарачым, але ім не прывыкаць. Калектыў мае сваіх прыхільнікаў і заўсёды здзіўляе слухачоў новымі цікавымі канцэртнымі праектамі. "Аркестр тваёй краіны", — а менавіта такі слоган у знакамітага калектыву — чакае сваіх слухачоў на юбілейных канцэртах.

Вольга БРЫЛОН
Фота с сайта Навасібірскай дзяржаўнай філармоніі.

Кветкавы рай

У нас у Ветцы намаганнямі стараверaў былі пасаджаны ў свой час унікальныя сады з райскімі яблычкамі. Усе яны сталі ўніверсальным правобразам агульнага райскага саду, раслінныя арнаменты якога старанна выразаліся на залатых акладах абразоў, на драўляных аконных ліштвах і ніколі не паўтараліся па прычыне непаўторнасці веткаўскіх разьбяроў. У кожнага творцы — свой узровень, вышэй якога — аніяк. Падаецца, веткаўскія летапісцы, іканапісцы, разьбяры і гравёры ўвогуле яго не мелі, бо ў добрым садзе ніколі не расце пустазелле. Адно толькі — плады, ягады ды кветкі. Доўга думаў, чаму выстава работ Святланы Валасюк называецца "Узроўні".

Яўген РАГІН

Дапамагла малодшы супрацоўнік музея-сядзібы "**Пружанскі** палацык" Арына Сысаляшна. Менавіта тут і працуе персанальная выстава кобрынскай мастачкі. Вось што піша аўтарка ліста: *"Святлана Міхайлаўна нарадзілася ў Жабінцы. Яе бабуля таксама была мастачкай. У 2004 годзе Валасюк скончыла Кобрынскі прафесійна-тэхнічны каледж выяўленчага мастацтва і народных мастацкіх промыслаў, затым — мастацкі факультэт Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Святлану натхняе жыццё ва ўсіх яго праявах, яна настойліва шукае вобразы і іх сутнасць у людзях, прыродзе, кнігах, музыцы, ва ўсім, што атачае чалавека..."* Цудоўна сказана! Гэты пошук па ўсіх узроўнях існавання і ўяўлення дазваляе мастачцы ўзнімацца ўверх, як па прыступках. *"Яе творчае крэда,* — дадае Арына, — *"Я шукаю, я імкнуся...", і, трэба заўважыць, Святлана заўсёды і ва ўсім знаходзіць нешта адмысловае і станоўчае".* З 2009 года мастачка бярэ ўдзел у прэстыжных выставах, вандруе, стараецца ўсё асэнсаваць. З усяго гэтага і нараджаецца мастацтва. Яна жыве ў Кобрыне, працуе мастакам-дызайнерам, цікавіцца літаратурай, спрабуе сябе ў батыку, займаецца камп'ютарнай графікай, эксперыментуе ў алейным пастозным жывапісе, спалучае экспрэсіянізм з авангардам. У Пружанскім палацыку экспануецца 28 работ Валасюк. Сюжэты — этнічна-гістарычныя, фантазійныя, фальклорныя. У пісьме адзначана: *"Асабліва радуе вока кветкавы рай Святланы Валасюк".*

Райскі сад, райскія кветкі... У рай трапляюць не толькі добрыя людзі, але і коні. Прынамсі, у гэтым быў перакананы мой родны дзядзька Ілля, у гаспадарцы ягога быў конь Васька. І якая бяда, калі ён (не дзядзька, а конь) рэагаваў толькі на нелітаратурныя выразы. Гэта трагедыя не Ваські, а Іллі. Так што конік, які прайшоў па ўсіх сваіх прыступках: напоўніцу адараў і адскародзіў — у конскім раі. Але пра яго — іншым разам.

Калі чалавек страціць магчымасць здзіўляцца, ён згубіць бляск у вачах і не здолее ўзнімацца па прыступках удасканалення. Гэта цудоўна разумеюць у **Магілёўскай** бібліятэцы-філіяле № 4 імя Міхаіла Лермантава. І не толькі разумеюць, але і канкрэтныя справы робяць. *"Мы правялі дзень адкрытых дзвярэй,* — распавядае загадчык установы Вікторыя Падчапіла. — *Народу, натуральна, было болей, чым звычайна".* Я патэлефанаваў у бібліятэку і даведаўся, ці павялічылася пасля рэкламнай акцыі колькасць чытачоў. Мне паведамілі, што ўсё так і было. У той дзень з'явілася 44 новых чытача, для ўсіх наведвальнікаў было выдадзена 469 кніг і часопісаў, што ў два з паловай разы болей, чым у шараговы дзень. А цяпер давайце ўдакладнім, чым вабіла акцыя. Нечаканасці пачаліся ў фае. Тут чытачоў сустрэў кніжны дождж (са столі да падлогі звісалі знітаваныя супервокладкі. Ахвотныя маглі сфатаграфавацца з улюбёным выданнем. Для дзяцей падрыхтавалі казачную тэатралізацыю і экскурсію па бібліятэчных залах. Даспадобы прыйшоўся і інтэрнэт-урок "Бібліятэка — навігатар у моры інфармацыі". Квэст называўся арыгінальна — "Мы тое, што мы чытаем". Апрача выстаў была яшчэ і вулічная акцыя "Калі вы не чыталі, мы ідзём да вас!" Вось такія ўзроўні-прыступкі.

Майстру з **Бабруйска** Аляксандру Шэндераву дапамог узняцца... Казімір Малевіч. Загадчык аддзела мастацкай творчасці Бабруйскага палаца мастацтваў Наталля Кулікова, якая згадваецца ці не ў кожным аглядзе нашага ліставання, распавядае: *"Аляксандр Данілавіч заняўся шматковай творчасцю ў 1996 годзе. Усё атрымалася выпадкова. Механік па настройцы і рамонце швейных машын дзеля эксперыменту настрочваў адзін шматок тканіны на другі. На вочы яму трапіліся супрэматычныя творы Казіміра Малевіча. Шэндераў зразумеў, што робіць нешта вельмі падобнае. У выніку з'явіліся шматковыя пано "Эвалюцыя чорнага квадрата", "Экспрэсія", "Канцэнтрацыя"... У 2014 годзе гэтыя работы дэманстраваліся ў* **сталічным** *Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва. Пазней былі створаны "Прысвячэнне Казіміру Малевічу", "Менора і дзесяць запаветаў.."* Вельмі цікава і тое, што майстар зрабіў унікальную прыстаўку да швейнай машынкі, каб атрымліваліся ідэальныя акружнасці. Дадам і тое, што гэты ўздым па творчых прыступках ніякім чынам не быў выпадковым. Шлях творцы вызначае Бог. І ўсё тут заканамерна. Зерне, кінутае рукой Усявышняга ў глебу, рана ці позна прарастае.

На здымках:
1 Вось ён, быхаўскі саламяны павук.
2 Каманда з Клімавічаў на Смаленшчыне.
3 Кветкавы рай Святланы Валасюк.
4 Дзень адкрытых дзвярэй у Магілёўскай бібліятэцы імя Лермантава.

Рух наперад немагчымы без іспытаў. У мастацтве гэта фестывалі ды конкурсы. Пра адзін з іх прыйшоў анонс з **Мінскага** цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі "Ветразь". Тут прайшоў другі адкрыты конкурс беларускага народнага спеўнага і музычна-інструментальнага выканальніцтва "Згукі мінуўшчыны". Адны з заснавальнікаў — кафедра этналогіі і фальклору БДУКіМ, Беларускі фонд культуры. Конкурс адбыўся 11 сакавіка ў адпаведнасці з праграмай "Традыцыйная культура і моладзь". Удзельнікі — спеўныя ансамблі, музычныя інструментальныя капэлы, салісты-інструменталісты. У межах конкурсу — першы турнір салістаў-мультывыканаўцаў твораў беларускай народнай спадчыны.

А вось — фестываль. У **Ершычах Смаленскай** вобласці ладзілі пяты міжнародны фэст духоўнай песні і паэзіі "Дарогай дабрыні". Суседнюю **Магілёўшчыну** прадстаўлялі, як паведамляе ўдзельнік мерапрыемства, ветэран працы і краязнаўца Іван Лапо, клімаўчане і хацімчане. *"Перад пачаткам мерапрыемства,* — распавядае аўтар ліста, — *сябры Клуба традыцыйных славянскіх каштоўнасцяў, што дзейнічае пры* **Клімавіцкай** *раённай бібліятэцы імя паэта-земляка Івана Пехцерава, наведалі храм у гонар Сымона Богапрымцы. Фестываль ладзіўся ў мясцовым цэнтры культуры. Гэта было сапраўднае свята песень і вершаў".*

Яшчэ адзін конкурс — XV рэспубліканскі фестываль народнай творчасці ветэранскіх калектываў "Не старэюць душой ветэраны", што прайшоў 4 сакавіка ў **Магілёўскім** абласным метадычным цэнтры народнай творчасці і культурна-асветнай работы. **Бабруйск** прадставіла студыя габеленнай вышыўкі "Надзея" пад кіраўніцтвам Алы Кірылавай. Студыя, якая працуе пры Бабруйскім палацы мастацтваў, узнагароджана на фэсце дыпломам першай ступені. Інфармацыю даслала, натуральна, Наталля Кулікова. А вось што кажа пра гэты фестываль вядучы рэдактар Магілёўскага абласнога метадычнага цэнтра Крысціна Башарымава: *"На сцэну выйшлі каля 190 пераможцаў двух адборачных этапаў. У рамках канцэрта было прэзентавана 18 нумароў у розных жанравых катэгорыях."*

У працяг фестывальнай тэмы — расповед пра IV міжнародны конкурс маладых выканаўцаў на духавых інструментах Naujene Wind 2020 у Даўгаўпілсе. Для вучняў і настаўнікаў дзіцячай школы мастацтваў з **Парэчча Гродзенскага** раёна гэтая творчая прыступка — даўно звыклая, бо яны пастаянна ўдзельнічаюць у згаданым форуме. Вось і на гэты раз удзел быў вельмі выніковым: трубач Уладзімір Мінін з Парэчча атрымаў Гран-пры. Варта дадаць, што летась восем вучняў Парэцкай ДШМ атрымалі заахвочванні спецфонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. На сёння ва ўстанове 21 чалавек адзначаны стыпендыямі, заахвочвальнымі прэміямі і матэрыяльнай дапамогай фонду.

Здольнасць здзіўляцца абавязкова прадугледжвае наяўнасць таленту здзіўляць. Вось таму перакананучы прыклад. Метадыст **Бераставіцкай** раённай бібліятэкі імя Восіпа Кавалеўскага Алена Аліфяровіч распавядае, што яе бабуля цягам доўгага часу збірала паштоўкі. 67 з іх, прысвечаных святу 8 сакавіка, дэманструюцца на выставе памянёнай бібліятэкі. Самы стары экспанат датуецца 1961 годам. Ёсць паштоўкі, дасланыя з Літвы, Украіны. Выстава, як піша аўтарка ліста, выклікала пэўны ажыятаж сярод чытачоў старэйшага пакалення. Кожны хацеў знайсці паштоўку і запэўніць: "У мяне была такая ж!" *"Менавіта для мяне гэтая выстава,* — прызнаецца Алена, — *ушанаванне памяці пра дарагога мне чалавека. Вядома ж, што памяць, якая перадаецца з пакалення ў пакаленне, застаецца назаўжды".*

Я ўсё здзіўляўся, чаму няма такога фэсту. І ўрэшце ён з'явіўся! 28 лютага ў **Быхаве** работнікі цэнтра культуры і народнай творчасці ладзілі ўжо другі па ліку раённы фестываль дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва "Саламяны павук". І тут усё невыпадкова. Традыцыя іх саламяных абярэгаў у раёне занесена у Дзяржспіс аб'ектаў гісторыка-культурнай каштоўнасці краіны. Тут сабрана самая вялікая ў **Магілёўскай** вобласці калекцыя павукоў.

Пішыце пра цікавае! Сустрэнемся праз тыдзень.

К

Абваранка на далоні

Не так даўно ў Смаргоні пачалі распрацоўваць гастрабрэнд "Смаргонскія абаранкі". Тады ўзнікла лагічнае пытанне: "Ці ёсць у нас хто-небудзь, хто б мог адрадзіць сакрэты старажытнага майстэрства?" Чалавек знайшоўся не адразу.
У 25-ці кіламетрах ад Смаргоні, у Вішневе, жыве 77-гадовая Ядвіга Хадалёнак. Адзіная, хто ведае рэцэпт старасмаргонскай "абваранкі".

Ядвіга Хадалёнак.

ПРАПОРЦЫІ — ГАРМАНІЧНЫЯ

Шэсць гадоў таму жанчына пераехала з суседняй Волькаўшчыны ў больш цывілізаванае Вішнева — цэнтр сельсавета. Купіла дом з гаспадарчымі прыбудовамі. У якасці бонусу атрымала яшчэ адзін. Без перабольшання, гістарычную каштоўнасць. Гэтай хаце больш за сто гадоў, і там ёсць старажытная печ у рабочым стане, у якой можна прыгатаваць пірагі і абаранкі.

Менавіта ў старую хату запрасіла нас Ядвіга Флар'янаўна і дзялілася старажытным рэцэптам прыгатавання "абваранак", які пераняла ад сваёй маці 1915-га года нараджэння.

Для пачатку трэба дроў альховых (не інакш!) насекчы, печ затапіць, цеста замясіць...

Абараначніца пералічвае неабходныя інгрэдыенты для цеста: "Пшанічная мука, малако, дрожджы, соль, цукар, яйка, поснае масла, сметанковае масла, трохі ваніліну. Можна мак ці карыцу. Строгага рэцэпта не прытрымліваюся — усё на вока".

Прапорцыі павінны быць гарманічнымі — першы сакрэт смачнай стравы. Калі цеста "падышло", можна і абаранкі "гнуць". Памер абараначніцы вымяралі на ўказальны палец. Гэта маленькі абаранак. А былі і вялікія - на тры і нават на чатыры пальцы.

Спачатку "кольцы" абварвалі (кідалі ненадоўга ў вар), а пасля выкладалі на бляху і выпякалі ў печах (хвілін з дзесяць) і — вуаля, страва гатова!

НАШ КЛАД!

— Напэўна, абаранкі, калі вы былі дзіцём, выраблялі нячаста?

— Ой, канешне... На Каляды, Новы год, Вялікдзень і на Яна — калі быў фэст у Вішнеўскай парафіі, — зазначае Ядвіга Флар'янаўна. — Рабілі б, можа, і часцей, ды не было з чаго пячы. Дзе той пшанічнай мукі ўзяць? А ў пост пяклі посныя абаранкі: мука, алей, вада ды соль.

— А калі вы зрабілі сваю першую "абваранку"?

— Гадоў у трынаццаць — чатырнаццаць я станавілася побач з мамай і вучылася мясіць цеста. Сакрэты смачных абаранкаў расказвала і суседка (дарэчы, бабка-павітуха), якая таксама вельмі добра ўмела абыходзіцца з цестам. І абаранкі, і пірагі смачныя пякла. І я палюбіла гэту справу. Наогул вельмі люблю гатаваць. І гасцей люблю. Уся мая радня была гасцінная, няпрагная.

— Ядвіга Флар'янаўна — майстрыха на ўсе рукі. Наш скарб! — ускліквае загадчыца вішнеўскага Дома культуры Альфрэда Дыро. — Добра ўмее не толькі абаранкі выпякаць, але і на кроснах ткаць, кручком і на спіцах вязаць. Усё гэта ад маці пераняла. Да нядаўняга часу ў нашым ДК яна гурток па ткацтву вяла, моладзь ткаць вучыла.

Спрытная, актыўная, усмешлівая жанчына. Ядвіга Флар'янаўна зусім не выглядае на свае семдзясят сем. Майстар-клас па выпечцы абаранкаў яна правяла не толькі для мяне. Напярэдадні да яе прыязджаў Аляксандр Мацяс з АНТ. Так што цяпер, як выпякаць смачныя смаргонскія абаранкі, ведаюць не толькі яе сяброўкі і аднавяскоўцы. Уся Беларусь.

Тая хата, што печчу багата.

СМАЧЭЧА ДЛЯ СМАРГОНЦАЎ

На наступны дзень пасля нашай сустрэчы мы зноў віталіся з вішнеўскай абараначніцай. На падворку "Арцель "Мукасолька", які ладзілі вішнеўскія культработнікі падчас рэспубліканскага фестывалю-кірмашу "Смаргонскія абаранкі". Жанчына, апранутая ў святочны народны касцюм, частавала смаргонцаў і гасцей горада сваім печывам, дзялілася рэцэптамі смачэчы. На свята яна прывезла пірагі і некалькі падносаў румяных абаранкаў.

Напярэдадні фестывалю ўнук нашай гераіні прыехаў з Мінска да бацькоў, яны таксама ў Вішневе жывуць. І да бабці павітацца забег.

— Зноў, бабуля, пячэш абаранкі і пірагі?

— Пяку...

— Дык бізнес адкрывай, — пажартаваў.

Хто ведае, а можа, і адкрые. І ў 80 гадоў жыццё, бывае, толькі пачынаецца. Асабліва ў абараначніцы.

P.S. У Спісе нематэрыяльных каштоўнасцяў Беларусі сярод 125 аб'ектаў смаргонскія "абваранкі" не значацца. Пакуль не значацца. Усяму свой час.

У ТЭМУ.

Днямі адзін з жыхароў райцэнтра выказаў прапанову, да якой варта прыслухацца: было б добра, каб у нашым горадзе з'явіўся невялічкі магазін "Смаргонскія абаранкі". Каб можна было там купіць абаранкі, сушкі, крэндзелі... Прадукцыю не толькі смаргонскага хлебазавода, але і іншых вытворцаў, у тым ліку прыватных асоб. Напрыклад "Абаранкі ад Ядзі, Нюрачкі, Мар'янаўны" (ці, як варыянт, ад Флар'янаўны — аўт.). Гэта быў бы наш смаргонскі брэнд праз стагоддзі.

Перад уваходам можна было паставіць драўляную скульптуру мядзведзя і лавачку. І вось вам цікавая фотазона для смаргонцаў і турыстаў.

Сёння наша задача — захаваць сакрэты печыва і майстэрства жыхароў нашай малой радзімы. І, хто ведае, можа моладзь паспрабуе гэтымі сакрэтамі скарыстацца і прадоўжыць гісторыю смаргонскіх мядзведзяў і абаранкаў.

Галіна АНТОНАВА
Смаргонь
Фота аўтара

Узор тагачаснай жанчыны

Правы, а значыць і розныя магчымасці жанчыны ў XVI — XVIII стагоддзях, шмат у чым былі абмежаваныя. Яе лёс залежыў ад паходжання, сямейнага і матэрыяльнага становішчаў ці іншых індывідуальных асаблівасцяў.

Амаль усё сваё жыццё жанчына знаходзілася пад апекаваннем мужчыны — бацькі, брата ці апекуна, а пасля і мужа. Ідэальны яе ўзор — жонка, маці, гаспадыня. Мужчынам пры выбары жонкі не рэкамендавалася кіравацца прыгажосцю жанчыны, важна было тое, каб яна была цнатлівай, сціплай, паслухмянай і працавітай. Лічылася, што гэта былі менавіта тыя якасці, якія дапамагалі ёй выконваць абавязкі жонкі. Да таго ж пры выбары партнёру не звярталі ўвагу ні на пачуцці, ні на ўзрост. Да прыкладу, Мікалай Крыштоф Радзівіл Сіротка ажаніўся толькі ў 35-гадовым узросце на 15-гадовай Альжбеце Яўхіміі Радзівіл з роду Вішнявецкіх. Але, трэба адзначыць, што шлюб іх быў шчаслівы. Альжбета падаравала мужу дзевяць дзяцей. Мець шмат дзяцей у сям'і было тады звычайнай справай. Ганна-Кацярына Радзівіл з роду Сангушкаў увогуле нарадзіла Каралю Станіславу Радзівілу 16 дзяцей за 27 гадоў сумеснага жыцця. Прычым, пераўзыходзячы свайго мужа па моцы характару і розуму, Ганна-Кацярына аднак ніколі за ўсё яго жыццё не асмелілася быць кімсьці большым для яго, чым проста жонкай. Паслухмяная мужу, яна ўмела своечасова даць правільную параду і выказаць уласную прапанову.

Свой вольны час часцей за ўсё жанчыны прысвячалі малітве, дабрачыннасці і, канешне, клопату аб дзецях, прычым, не толькі сваіх. Роля маці з'яўлялася найважнейшай роляй у жыцці жанчыны. Менавіта маці фарміравала веды і характар дзяцей. Была для іх выхавацелькай і настаўнікам. Толькі прадстаўнікі магнацкіх родаў маглі дазволіць сабе ўтрымліваць настаўніка ці аддаць дзяцей у навучальную ўстанову. Вядома, што Ганна Луіза Радзівіл з роду Мыцельскіх — другая жонка Міхала Казіміра Радзівіла Рыбанькі прыкладала ўсе намаганні, каб яе дзеці атрымалі добрую адукацыю. Так, дзякуючы яе стараанням і пры падтрымцы мужа яе трох сыноў ад першага шлюбу з Лявонам Міхалам Радзівілам — Мікалая, Міхала і Мацея прынялі ў езуіцкі калегіум у Вільні ў 1758 годзе. А для іх навучання нават наўмысна выклікалі педагогаў з Варшавы.

Так ці інакш, але шлюб для жанчын быў сродкам вызвалення ад апекі бацькоў ці сваякоў і дазваляў у некаторых выпадках палепшыць сваё становішча ў грамадстве. Але гэта ў першую чаргу залежыла ад характару і вынаходлівасці мужа.

Вераніка КРАСОЎСКАЯ
малодшы навуковы супрацоўнік музея "Замкавы комплекс "Мір"

Салісты ўзорнага фальклорнага гурта "Васілёчкі" з Жытомля гушкаліся і таксама гукалі вясну.

Любоў, вясна і прыгажосць.

Як мы "пабудавалі" Школу фалькларыстаў

Прафесійныя нататкі пасля семінара-практыкуму

У Гродзенскім раёне ёсць кола людзей, якія адзначаюць даты народнага календара прыблізна так, як іх святкавалі нашы продкі. Не пакарыстацца гасцінным запрашэннем Тарэсы Адамовіч, галоўнага рэжысёра народнага тэатра народнай песні "Матуліна песня", пагукаць вясну "па-старому" спецыялісты Гродзенскага раённага культурна-інфармацыйнага цэнтра не змаглі. Таму ў апошні дзень лютага арганізавалі семінар "Старажытныя народныя святы і абрады, сакральныя язычніцкія і хрысціянскія месцы, традыцыйныя іміджавыя культурныя мерапрыемствы і іх пазіцыянаванне як аб'ектаў турыстычнага бізнесу".

Гуканне вясны.

Наталля Рамановіч з масленічнымі блінцамі.

На семінар-практыкум былі запрошаны не толькі кіраўнікі фальклорных калектываў, спецыялісты аддзела этнаграфіі, фальклору і рамёстваў, бібліятэкары, але і маладыя перспектыўныя людзі, якія знаходзяцца ў рэзерве кадраў, а таксама — актывісты аматарскіх аб'яднанняў для старэйшага пакалення.

ЦЭНТР ПА ДАСЛЕДАВАННІ ТРАДЫЦЫІ

У першую чаргу гаворка ішла пра неабходнасць арганізацыі работы Школы фалькларыстаў, адкрыццё якой якраз і прымеркавалі на дзень семінара. Новае ўтварэнне павінна стаць своеасаблівым цэнтрам фальклору ў раёне, а яго супрацоўнікі (не толькі работнікі культуры ў галіне народнай творчасці, але і проста актывісты, якія цікавяцца народнай творчасцю) будуць планамерна і мэтанакіравана весці працу па даследаванні традыцыйнай культуры краю, распаўсюджванні рэгіянальнага мастацтва ў розных яго формах.

Прэзентацыя "Развіццё работы этнаграфічных музеяў, музейных пакояў, экспазіцый і выстаў як сродак захавання лакальных культурных традыцый" была скіравана на тое, што сёлета музеі і музейныя экспазіцыі ў аграгарадках Індура, Адэльск, Абухава, гарадскім пасёлку Сапоцкін і ў вёсцы Зарачанка прыступяць да рэалізацыі новага праекта "Музей і дзеці". Задача яго — адраджэнне нацыянальнай аўтэнтычнай культуры і традыцый. І першым мерапрыемствам стане арганізацыя "Школы батлейкі" ў Індурскім цэнтры культуры, дзе размешчаны Музеі лялькі.

На радасць шпакам.

КАЛІ ЛЯЛЬКА — У ПАШАНЕ

Зраблю невялічкі адступ, каб нагадаць чытачу, што ў раёне калісьці ўзнікла тэндэнцыя да стварэння пры клубных установах арыгінальных музеяў. На сёння ў вёсцы Зарачанка, да прыкладу, існуюць экспазіцыі беларускага ручніка і ваеннай формы, у Сапоцкіне — музей пісанкі. А ў 2019 годзе ўзнікла музейная экспазіцыя ў Індуры.

Чаму менавіта лялькі? Усё тлумачыцца проста. Майстар Ірына Рынкевіч разам са сваімі гурткоўцамі выраблялa традыцыйныя лялькі-абярэгі. Выкарыстоўвалася пры гэтым салома, а кожная фігурка была апранута ў нацыянальны касцюм. І калі дыскатэкі перасталі быць запатрабаванымі, у раёне вырашылі стварыць у танцавальнай зале музей лялькі. Іх збіралі ўсёй раённай грамадой. Цяпер у экспазіцыі — каля 300 музейных прадметаў.

Семінар прыйшоў ды высновы: інтэрактыўнасці музею надасць Школа батлейкі.

БАТЛЕЕЧНАЯ АДУКАЦЫЯ

Натуральна, што дзяцей і моладзь трэба далучаць да захавання і вывучэння аўтэнтычнага фальклору і народных традыцый, паколькі духоўна-культурная пераемнасць вельмі важная для фармавання гарманічна развітай і адказнай асобы.

Народныя каляндарныя абрады, якія адлюстроўваюць тысячагадовыя ўяўленні нашых продкаў пра навакольны свет — гэта свайго роду духоўны падмурак, сховішча каштоўнасных арыенціраў, і работнікі культуры павінны выкарыстоўваць адукацыйны і выхаваўчы патэнцыял мясцовай культурнай спадчыны ў працы з падрастаючым пакаленнем.

Вывучэнне гісторыі батлейкі, яе рэпертуару — таксама дзейсны сродак усведамлення беларускай традыцыі.

ГАРА НАДЗЕЙ І НЕ ТОЛЬКІ

Якія ж ёсць у раёне сакральныя язычніцкія і хрысціянскія месцы, а ў сувязі з гэтым — традыцыйныя іміджавыя культурныя мерапрыемствы? Для таго, каб адказаць на гэтае пытанне, мы наведалі аграгарадок Капцёўку.

Загадчык мясцовага цэнтра культуры Эльвіра Чыжанкова разам з ксёндзам Міхалам Ластоўскім запрасілі ўдзельнікаў семінара ў касцёл Унебаўзняцця Найсвяцейшай Панны Марыі з цудадзейнай іконай Божай Маці Яснагурскай, расказалі пра "гару надзей" — другое па велічыні ўзвышша ў Гродзенскім раёне, і алею памяці з магільных камянёў.

Прадоўжыла экскурс па гісторыі Капцёўкі супрацоўніца мясцовай бібліятэкі Алла Варанко, якая адзначыла, што пошук краязнаўчай інфармацыі — няпростая справа, таму што асноўнай яе крыніцай з'яўляюцца ўспаміны старажылаў, запісы ў архівах мясцовых школ і бібліятэк. Большасць жа матэрыялаў і сур'ёзных навуковых даследаванняў знаходзяцца ў фондах Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі і архівах Польшчы, да якіх не заўсёды ёсць доступ.

ЗРАБІ ШПАКОЎНЮ

Заглыбіцца ў атмасферу народнай песеннай і танцавальнай культуры ўдзельнікі семінара змаглі падчас этнавандроўкі ў глыбінку, у вёску Жытомля, дзе змаглі паўдзельнічаць у "Гуканні вясны". У рамках творчай майстэрні "Жывая традыцыя" ад народнага фальклорнага гурта "Жывіца" Квасоўскага цэнтра культуры і развіцця народнай творчасці ды народнага тэатра народнай песні "Матуліна песня" Жытамлянскага дома фальклору ўдзельнікі семінара, жыхары і госці невялікай вёскі навучыліся выконваць гукальныя абрадавыя песні і карагоды, прынялі ўдзел у інтэрактыўных майстар-класах па традыцыйных беларускіх веснавых гульнях, побытавых танцах.

Лепшыя гаспадыні-кухаркі раёна Ірына Стральчэня з Абухава, Лілія Розмысла і Галіна Міклашэвіч з Жытомля напяклі такую колькасць "жаваронаўкаў" і бліноў, што хапіла ўсім прысутным.

Новенькія рознакаляровыя шпакоўні, якія зрабілі бібліятэкары раёна і чытачы ў рамках эколага-літаратурнай акцыі, развесілі ў парку Жытомлі.

Прысутныя не толькі спявалі "вяснянкі", вадзілі карагоды, забаўляліся гульнямі, але і займелі папяровыя і саламяныя птушкі-вяснянкі, вясновыя паштоўкі, лялькі-абярэгі, якія зрабілі ў творчай майстэрні адзела этнаграфіі, фальклору і рамёстваў.

РАСКЛАД НА ЗАЎТРА

А вынікам вандроўкі-рэпартажу стане выпуск невялікага відэароліка.

Па народным звычаі, ад таго, як сустрэнеш вясну, залежыць дабрабыт хатняй гаспадаркі. Падчас семінару было ўрачыста, весела і шумна, значыць багацце, дабрабыт і шчасце Школе фальклору забяспечаны.

Як вы зразумелі, фальклорная школа прывязана да нашага раённага культурна-інфармацыйнага цэнтра фармальна. Я супраць доўгіх пасяджэнняў. Я — за выезды, экспедыцыі, за практычнае абагульненне досведу. У бліжэйшай перспектыве — наведванне Сапоцкіна падчас Вялікдня, потым — візіт у Азёры. І ў віры нашых агульных спраў будуць знаходзіцца не толькі клубнікі, але і бібліятэкары і, самае галоўнае, — людзі сталага веку, якія любяць спяваць, танцаваць, ведаюць рамёствы і памятаюць сівыя легенды нашага краю. І эфектыўнасць папулярызацыі фальклору — у аб'яднанні нашых намаганняў.

Наталля РАМАНОВІЧ,
вядучы метадыст па рабоце ў галіне традыцыйнай мастацкай культуры, нематэрыяльнай культурнай спадчыны і фальклору Гродзенскага раённага культурна-інфармацыйнага цэнтра

Ян Яраш: “Быў рэальна шокавы стан”

Калі сёлета беларускі адбор на конкурс песні “Еўрабачанне” абышоўся без традыцыйных скандалаў, то чалавечую драму мы ўсё ж такі назіралі. Здавалася б, вось ён — наш удзельнік форуму — Ян ЯРАШ, але тут абвяшчаюць балы, атрыманыя дуэтам VAL пры глядацкім галасаванні, і... прабач-бывай, Ратэрдам, — будучая сталіца знакаміта-неадназначнага фестывалю. А, можа, яно і да лепшага, што ўсё так выйшла? Упэўнены, музычная кар’ера таленавітага выканаўцы і без дадзенага творчага спаборніцтва складзецца выдатна.

Алег КЛІМАЎ / Фота аўтара

“А мне не цікава шоу. Мне цікава пісаць нармальныя песні, выконваць іх, граць нармальную музыку. Можа, конкурсы — сапраўды не маё?

З КОНКУРСАМІ СКОНЧАНА?

— Што адчувае артыст, які ўжо адной нагой знаходзіцца на “Еўрабачанні”, а на самым фінішы галасавання яго абыходзіць іншы прэтэндэнт на паездку на конкурс?

— Я першапачаткова не меркаваў заняць высокае месца, на першае ўжо сапраўды не разлічваў. А члены прафесійнага журы раптам адзін за адным сталі ставіць мне вышэйшы бал. Заставалася справа за галасаваннем гледачоў. І тады падумалася, што якую ацэнку яны б ні паставілі, усё роўна на конкурс еду я — ніхто з канкурэнтаў ужо не зможа абагнаць. Быў рэальна шокавы стан. І тут мяне гледачы апусцілі на зямлю, даўшы ўсяго шэсць балаў. І гурт Chakras мяне нагнаў, а гурт VAL і ўвогуле перагнаў. Значыць, усё правільна, значыць, простым людзям іх нумар спадабаўся больш. Аднак мне вельмі прыемна, што менавіта міжнароднае журы адпаведным чынам адзначыла маю песню. Значыць, іду ў сваёй творчасці дакладнай дарогай, а любоў публікі... прыйдзе. Яна ўжо прыйшла — праўда, не масавага слухача. А ці стрэсануў я ад таго павароту падзей, аб якім ты казаў? Безумоўна.

— На мой погляд, кампазіцыя Fire, з якой ты “адбіраўся”, што б хто ні казаў, цалкам у фармаце “Еўра”. На ім перамагаюць і ў “топах” альбо безумоўныя баевікі, альбо вось такія песні — здавалася б, не хітовыя (ужо прабач), але вельмі прафесійна, класна зробленыя, стыльна аранжыраваныя.

— Калі казаць аб нашым з хлопцамі-інструменталістамі нумары наогул, яго нельга было сапсаваць. Ён не складаны — там няма харэаграфіі, працы з тэлекамерамі, з заднікам сцэны. Але ён — так, дужы. Лаканічны, інтэлігентны. Я разумею, што “Еўрабачанне” — гэта перш за ўсё шоу. Аднак і нармальным песням на конкурсе месца знаходзіцца. Fire — песня нармальная. З вакалам, з музыкай, з гісторыяй. Прыгожы, якасны прадукт. Пра яго 80 працэнтаў журналістаў казала так: “Як ты сабе ўяўляеш гэтую песню ў рамках шоу-конкурсу?” А мне не цікава шоу. Мне цікава пісаць нармальныя песні, выконваць іх, граць нармальную музыку. Можа, конкурсы — сапраўды не маё?

— Адсюль падрабязней, калі ласка. Дзядзька Ваня мне неяк сказаў, што ён, было, “падсеў” на конкурсы, раз за разам прымаючы ўдзел у іх. За тваімі плячыма таксама не адзін конкурс...

— Конкурс — выдатная магчымасць самапіяру — і аблічча творчага, і, уласна, твару чалавека. Артысту ж, калі ён не моцна пажылы, натуральна, хочацца даваць больш канцэртаў. І калі выканаўца не занадта вядомы, папулярныя конкурсы і даюць яму магчымасць заявіць аб сабе вялікай аўдыторыі, стаць вядомым. Гэта самы танны спосаб прарэкламаваць уласнае імя. Тым больш, калі музыка ў спевака першапачаткова не камерцыйная, не адкрыта на продаж — як у маім выпадку. А бацькі мае не нафтавікі. І прадзюсары не ліпнуць. Я б, дарэчы, не адмовіўся ад тлумачальнага маркетолага. Расейцы прапаноўвалі сябе ў прадзюсары, прапаноўвалі кантракты — кабальныя, тэрмінам ад пяці да дзесяці гадоў, што мяне, вядома, не прывабіла.

Ідучы на тэлеконкурсы — іх у мяне... шэсць, ці што, — я заўсёды наступаў на адны і тыя ж граблі, заяўляючы песні не для шырокай аўдыторыі гледачоў: іх маглі ацаніць прафесіяналы, але не масавы слухач. І я прынцыпова адмаўляўся прымаць тыя правілы гульні, якія дыктавалі праекты, што трэба курчыць з сябе пакутніка, распавядаць пра пераадоленне жыццёвых цяжкасцяў, “гнаць” іншую сацыялку. Гледачам, мне казалі, былі патрэбныя менавіта такія “сторыз” — з трагедзінкай, а не мае аповеды аб занятках фартэпіяна і вакалам па восем гадзін у дзень. Вось усе мае цяжкасці. І на фрыка я, вядома, не цягну, на тэлевізійнае “гарматнае мяса”, калі людзі прыходзілі на конкурсы чыста па прыколе, для “хайпа”, паржаць. Ці калі з людзей рабілі немаведама што. Гледзячы на гэта, мне рэальна станавілася не па сабе, думаю, і для іх псіхікі падобныя метамарфозы бясследна не праходзілі. Я не белы і пухнаты, і таксама спрабаваў розныя мадэлі паводзін, аднак заўсёды заставаўся чалавекам, а на паказ канфліктным, плеткаром, байкапісцам быць не магу. Дабіла ж тое, што адбылося на ўкраінскім “Х-фактары”, калі яго ўдзельнікі ўсталі ў лінію і па камандзе кінуліся да супрацьлеглай сцяны, на якой віселі паперкі з назвай песні, што трэба вывучыць за дзень. Натуральна, гэты “статак” па тэлевізары і паказалі, а не мяне, які спакойна ішоў ззаду ўсіх. Напэўна, тады я і вырашыў: больш удзельнічаць у падобных конкурсах не буду. Дык што, толькі адна мая “голая” творчасць не моцна цікавіла тэлебачанне? Крыўдна, ёсць такое. Зрэшты, адкрыты “зашквар” характэрны менавіта для “Х-фактару”. Украінскі “Голос краіны”, расійскія “Голас” і “Песні” значна інтэлігентней. На ўкраінскім праекце працавалі класныя менеджары і настаўнікі — я, між іншым, да Славы Вакарчука трапіў. Усё было па-людску, усё рабілася для таго, каб удзельнікі адчувалі сябе камфортна, розныя службы пад іх падладжваліся, не апускалі адмыслова ў нейкія неймаверныя ўмовы, як на тым жа “...Фактары”, калі адна са здымак скончылася ў дзесяць вечара, у дзве гадзіны ночы нас пасадзілі ў аўтобусы, адвезлі за 50 кіламетраў ад Кіева, засялілі ў жудасную, халодную гасцініцу і пад’ём прызначылі на шэсць раніцы. Расійскія “Песні” проста суперарганізаваная машына, дзе ўдзельнікам з іншых краін аплачвалі пералёты, пражыванне, харчаванне. Але такому няньканню трэба было адпавядаць — заўсёды ўсё рабіць на здымачнай пляцоўцы па раскладзе.

БЕЗ “БЕЗ БІЛЕТА”

— Для цябе стала сюрпрызам, што Віталь Артыст у канцы мінулага года распусціў свой гурт “БЕЗ БІЛЕТА”?

— Я прыйшоў у яго ў 2011-м, калі мне было 17. Прыйшоў, лічу, у пару самага росквіту каманды, адыграў у ёй гады тры. І з Віталікам пасля мы размаўлялі ўсё менш і менш... Так, дзіўнае рашэнне. Нядрэнна ведаючы Артыста, яго схільнасці ў чымсьці да “аферыстычных” учынкаў, ставіўся да заяваў Віталіка пра “закрыццё” ў снежні гурта як да чарговага маркетынгавага ходу. Я спрабаваў з ім пагаварыць на адборы на “Еўра” на гэтую тэму, аднак ён гаварыць адкрыта не стаў... Мне вельмі добра працавалася ў “БЕЗ БИЛЕТА” — шмат гастроляў, поўныя залы. Неверагодны вопыт набыў, будучы ў гурце.

— Тады чаму з яго сышоў?

— Пытаннейка ты задаў... Зараз падумаю... Успомню... Паралельна з “БЕЗ БИЛЕТА” я граў у нейкіх складах кавера і ў гурце Yellow Brick Road. З маім прыходам калектыў пачаў больш эксперыментаваць з гучаннем “змешваючы” Led Zeppelin і Depeche Mode. У “БЕЗ БИЛЕТА” мы з Віталікам старанна, плённа працавалі з сінтэзам гуку, наогул Артыст шмат у мяне чаго музычнага ўклаў. І вось гэтыя мае клавішныя навыкі я ўжываў і ў Yellow Brick Road. А тут у Мінску адбыўся канцэрт Depeche Mode. Так атрымалася, на яго я прайшоў за пляшку каньяку. І дзве з паловай гадзіны, разявіўшы рот, глядзеў надзвычайны канцэрт. З таго моманту і зразумеў, што хачу граць сваю музыку. Сваю, сваю, сваю... У “БЕЗ БИЛЕТА” “граў” думкі, якія хацеў выказаць Віталік. Пагаварыў з ім, растлумачыў, ён усё зразумеў.

— Мне вельмі падабаецца тое, што ты робіш. Але я разумею: на тваю стыльную, прыгожую, абсалютна сучасную якасную заходнюю музыку наўрад ці “дзяўбне” масавы айчынны слухач, якому бліжэй усе гэтыя славянскія “хопхэй, лала лэй”, хай даруе мне выдатны Агуцін. Ты сам разумееш тое ж?

— Я ж гады чатыры шукаў патрэбную стылёвую асаблівасць. І сачыў за тым, ці “трапляю” ў масавага слухача ці не. У мяне розныя па накіраванасці, па структуры, па аранжыровачнай думцы песні — нават у тым жа леташнім альбоме “Час не лечыць”. Шукаў, шукаў і ў рэшце рэшт зразумеў, што ў мэтавыя аўдыторыі 12+, 16+ мне не патрапіць, хоць я іх, сорамна прызнавацца, пазначаў. На “Час не лечыць” гучала самая што ні на ёсць поп-музыка, не такая — “саўковая”, “эстрадная”, — аднак усё ж поп-музыка. Але яна была... музычная! Я зразумеў — не хачу, не магу спрашчаць сваю творчасць. Ведаеш, што мне грэе душу? Калі людзі кажуць: “Ты ўсё правільна робіш. Хай у цябе будзе зала са ста чалавек, але яны ёсць дакладна толькі твае людзі, якія падзяляюць твае прынцыпы — жыццёвыя, творчыя”. І яшчэ. У Стынга якая музыка? Прыгожая, інтэлігентная, разумная. Колькі на яго канцэрт прыйшло, калі ён да нас прыязджаў? Ні ў якой меры не параўноўваю сябе з геніем, але, значыць, можна “прабіць” масавага слухача? Буду старацца.

— Што ў цябе з песнямі на беларускай мове?

— ...Я заўсёды баяўся на ёй спяваць, хоць спрабаваў. Не таму, што камусьці чагосьці павінен — людзям, радзіме, а таму што хацеў спяваць на беларускай, была такая ўнутраная патрэба. І ёсць. Але... баяўся аблажацца. Быў — сорамна ў тым прызнавацца — не ўпэўнены ў сваім вымаўленні. А ў пачатку года праспяваў Стынга на мове (на віяланчэлі мне падыгрываў сам Міхаіл Радунскі!): для арыгінальнай песні Shape Of My Heart тэкст на беларускай напісаў радыёвядучы і музыкант Мікіта Найдзёнаў. Пытанні па вымаўленні ўсё роўна ў мяне засталіся, аднак у цэлым водгукі аб маёй беларускай былі станоўчыя. На новым альбоме, які выйдзе ў 2020-м, паспрабую пагуляцца з мовамі: ён уключыць у сябе кампазіцыі на рускай і англійскай. І на беларускай!

К

Новы незвычайны музей з'явіўся ў Беларусі — Музей гадзіннікаў. Сабраныя ў ім менавіта беларускія гадзіннікі, якія на працягу 65 гадоў выпускае наш славуты завод "Луч". Размесціўся музей у Мінску ў новым будынку завода па адрасе Натуралістаў, 3, і сярод яго экспанатаў і самыя першыя гадзіннікі яшчэ 50-х гадоў, і самыя новыя, выпушчаныя проста ў нашы дні.

Надзея КУДРЭЙКА /
Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Ад "Зары" да "Зоркі Венеры"

Адкрыццё музея было прымеркавана да прэзентацыі новай мадэлі стыльнага гадзінніка "Аднастрэлачнік". Як кажа арт-дырэктар завода Іван Краўчэня, на постсавецкай прасторы "Луч" асацыруецца менавіта з гадзіннікамі з адной стрэлкай — гэта самая пазнавальная сучасная мадэль мінскага прадпрыемства. Увогуле, цяпер завод уважліва сочыць за модай і сусветнымі трэндамі, таму што гадзіннікі даўно сталі не проста прыборамі для вызначэння часу, а аксесуарамі, прадметамі са свету фэшн-індустрыі. У такіх умовах ледзь не на першае месца ў сучасным канкурэнтным асяроддзі выходзяць дызайн і крэатыўнасць.

А пачалася гісторыя яшчэ ў 1953-м годзе — тады было прынята рашэнне пра будаўніцтва завода, і неўзабаве на галоўным праспекце Мінска з'явіўся адзін з самых пазнавальных яго будынкаў. Першы гадзіннік "Зоря" — самы маленькі і вытанчаны з усіх, што тады выраблялася ў Савецкім Саюзе, — з'явіўся на свет 14 снежня 1955 года. Гэта быў жаночы наручны гадзіннік — у тыя часы "Луч" працаваў толькі для жанчын: менавіта з яго пачынаецца экспазіцыя новага музея. У ёй прадстаўлены толькі артэфакты — арыгінальныя вырабы свайго часу: нават раменьчыкі ў большасці выпадкаў з тых даўніх гадоў. Калі прайсціся па выставе ў храналагічным парадку, можна зрабіць цікавае назіранне — пачыналася ўсё з маленькіх, нават мініяцюрных мадэляў, і з кожным дзесяцігоддзем памеры гадзіннікаў павялічваліся. Іван Краўчэня тлумачыць гэта тым, што ў 50-я гады краіна яшчэ не адышла ад вайны, у ёй быў дэфіцыт абсталявання і матэрыялаў, а як сітуацыя выпраўлялася, то і памеры павялічваліся. Адпаведна раслі колькасць і разнастайнасць мадэляў.

Экспазіцыя падзелена на дзесяцігоддзі, і кожнае мае свой асаблівы твар — адлюстроўвае гісторыю не толькі саміх гадзіннікаў ці завода, але і ўсёй нашай краіны. У 60-х гадах з'явілася самая славутая, кананічная мадэль мінскага завода, якая зараз неверагодна цэніцца ў асяроддзі калецыянераў — "Луч 2209", з надзвычай тонкім механізмам. У тыя часы яна каштавала дастаткова дорага, і лічылася гадзіннікам для забяспечаных людзей, для кіраўнікоў, для эстэтаў. Неўзабаве "Луч 2209" перасталі выпускаць, бо выраб такога механізма быў нятанны і дастаткова складаны. І толькі ў 2018 годзе для знаўцаў і аматараў мадэль была перавыдадзена лімітаванай серыяй.

Арт-дырэктар завода "Луч" Іван Краўчэня.

Увогуле, у музеі можна ўбачыць больш за сотню гадзіннікаў. І самых традыцыйных, папулярных, пазнавальных — многія наведнікі, разглядваючы стэнды, могуць усклікнуць: "І ў мяне такі быў!", і самых дзіўных і незвычайных: напрыклад, яшчэ ў 60-я выпускаліся спецыяльныя гадзіннікі для медыкаў, з дапамогай якіх можна было лічыць пульс.

Макет гадзінніка з калекцыі, прысвечанай 100-годдзю УНОВИС.

Гадзіннік з калекцыі "Асоба" па матывах твораў Алены Кіш.

Дарэчы, 70-я гады з пункту гледжання дызайну і стыльнасці Іван Краўчэня лічыць дастаткова спрэчнымі — раздел гэтага дзесяцігоддзя мільгаціць рознымі дзіўнасцямі. Характэрная рыса 70-х — мадэлі, падобныя да тэлевізараў. Там жа можна ўбачыць незвычайную серабрыстую панду — а гэта гадзіннік для сляпых, ёсць і гадзіннікі для шахцёраў, будаўнікоў. Прылада для турыстаў — гэта ўжо 80-я, такая пластыкавая каробачка: увогуле заўважна, што надышла эра пластыку. Побач тое, што было выпушчана да Алімпіяды-80. Далей ідзе серыя часоў перабудовы, афармленая ў модных перабудовачных сімвалах — пачалася эпоха эксперыментаў з лагатыпамі. У 90-я гады стваралася таксама нямала адметнага, але не ўсе мадэлі трапілі ў экспазіцыю па розных прычынах.

— А вось мая любімая серыя з пачатку 2000-х, — працягвае знаёміць з экспазіцыяй музея арт-дырэктар завода "Луч" Іван Краўчэня. — Гэтую лінейку я лічу ўвогуле недаацэненай — яна з паўкаштоўных камянёў, з ручным роспісам фініфць: няма ніводнага аднолькавага гадзінніка, кожны ўнікальны. У нас яны каштавалі вельмі танна, а калі прыязджалі еўрапейцы ці кітайцы, то скуплялі іх проста пачкамі.

Акрамя гадзіннікаў у музеі можна ўбачыць і самыя сапраўдныя станкі, абсталяванне і многае іншае. У тым ліку і мадэлі з так званых лімітаваных калекцый, якія разлічаны не на серыйную вытворчасць і не на масавага пакупніка: у іх ёсць месца для творчасці, для крэатыўнасці — каб задаволіць моднікаў і годна прэзентаваць уласнае прадпрыемства. Паводле слоў Івана Краўчэні, "Луч" свядома стварае лімітаваныя калекцыі так, каб падкрэсліць сваю беларускасць, каб паказаць свету беларускую культуру, беларускае мастацтва. Напрыклад, дадзены старт новай серыі з назвай "Асоба", — героямі якой стануць выдатныя беларускія мастакі, паэты, музыканты і гэтак далей: напрыканцы мінулага года серыя адкрылася прысвячэннем мастачцы Алене Кіш. Ёсць у завода і серыя, што ў лютым выпускаецца да Міжнароднага дня матчынай мовы — зусім нядаўна з'явілася мадэль "Зорка Венера" з радкамі Максіма Багдановіча. Ёсць і традыцыйная калекцыя да 9 Мая: сёлета падрыхтоўка да гэтай даты асаблівая пільная, бо будзе адзначацца 75-годдзе Перамогі. І гэтак далей.

Лімітаваныя калекцыі карыстаюцца вялікай папулярнасцю як у жыхароў Беларусі, так і за мяжой — дзякуючы анлайн-продажу яны разлятаюцца, бывае, нават за некалькі дзён.

— Ёсць у нас і серыя, якую мы скіроўваем на папулярызацыю сучасных беларускіх мастакоў, — гаворыць Іван Краўчэня. — Яе сутнасць у тым, што мы даем мастакам гадзіннік як чыстае палатно, на якім яны могуць намаляваць і рэалізаваць што заўгодна — пачынаў серыю мастак Міця Післяк са сваім гадзіннікам "Тыповы беларус". Сёлета выпускаем калекцыю, прысвечаную 100-годдзю мастацкага аб'яднання УНОВИС — яна распрацавана дызайнерамі з Брэста, са студыі Grafit. Таксама папулярызуем нашы гарады і ствараем лімітаваныя калекцыі, прысвечаныя ім. Усяго не пералічыш.

Самы першы гадзіннік — "Заря" (1955 г.).

Самы знакаміты гадзіннік 60-х гадоў — "Луч 2209".

Усімі гэтымі адметнымі экспанатамі Музей гадзіннікаў будзе папаўняцца. Для наведвання ён адкрыты абсалютна бясплатна — патрабуецца толькі папярэдні запіс. Ужо відавочна, што гэта вельмі папулярнае месца для школьных экскурсій — для юных і маладых людзей там столькі адкрыццяў! Старэйшае пакаленне можа з настальгіяй згадаць сваю маладосць, сучасныя моднікі могуць ацаніць стыль і дызайн, аматары гісторыі проста атрымаюць задавальненне — кожны знойдзе для сябе нешта цікавае. К

Як "К" паведамляла ў папярэднім нумары, 3 сакавіка ў Мінскай гарадской ратушы адбылася прэзентацыя серыі жывапісных работ "Імя ў гісторыі Мінска. Гістарычныя асобы ў партрэтах сучасных мастакоў", прымеркаваная да даты першай летапіснай згадкі пра горад у "Аповесці мінулых гадоў". На шасці партрэтах прадстаўленыя гістарычныя асобы, якія ў розныя часы кіравалі Мінскам і яго ваколіцамі. У дзень прэзентацыі пра лёсы і здзяйсненні колішніх кіраўнікоў Мінска распавялі даследчыкі іх біяграфій — кандыдаты гістарычных навук Сяргей Тарасаў, Алег Дзярновіч і Андрэй Кіштымаў. Прапаноўваем агляд цікавостак з гэтай лекцыі-экскурсіі.

Антон РУДАК /
Фота аўтара

ПЕРШЫ МІНСКІ КНЯЗЬ

Аблічча Глеба Усяславіча мы можам бачыць яшчэ на мініяцюрах Радзівілаўскага летапісу і сярэднявечных манетах, а для мінскай ратушы яго партрэт стварыў Уладзімір Тоўсцік. Дакладнай даты нараджэння Глеба мы не ведаем, але ўпершыню ён згадваецца ў летапісах акурат у 1067 годзе, адразу ж пасля першай згадкі пра Мінск у сувязі з бітвай на Нямізе між полацкімі і кіеўскімі войскамі. Праз чатыры месяцы пасля бітвы кіеўскія князі, браты Яраславічы, запрасілі полацкага князя Усяслава Чарадзея на Дняпро каля Оршы для перамоваў. Усяслаў прыехаў туды з двума сынамі, Яраславічы пакляліся на крыжы не рабіць ім шкоды — і тут жа парушылі сваю прысягу, узяўшы палачан у палон і кінуўшы ў поруб. Адным з гэтых двух старэйшых князевых сыноў (а ўсяго іх налічвалася пяць) і быў Глеб.

Як вядома, неўзабаве Усяслаў з сынамі выйшаў з порубу — яго вызвалілі жыхары Кіева, якія паўсталі супраць сваіх уладароў і пажадалі, каб полацкі князь узначаліў кіеўскае войска ў змаганні супраць полаўцаў. Пасля гэтага Усяслаў пранёс багата іншых нягодаў ды прыгодаў, і, пражыўшы яшчэ амаль чвэрць стагоддзя, памёр у 1101 годзе. Полацкае княства ён перад смерцю падзяліў паміж сваімі сынамі — так Глеб зрабіўся першым мінскім князем. Атрымаўшы пасад у Мінску, ён варагаваў са сваімі братамі і нават ваяваў супраць іх — але, тым не менш, працягваў і ўнут-

Пра лёсы ды здзяйсненні

Зала славы кіраўнікоў Мінска

раную, і знешнюю палітыку свайго бацькі.

Аб праўленні Глеба распавядае археолаг, знаўца сярэднявечнага Мінска Сяргей Тарасаў. Горад на Нямізе ў часы Усяслава Чарадзея меў плошчу тры гектары, быў абнесены валам акружнасцю амаль у кіламетр, схілы якога былі ўмацаваныя 44 кубічнымі метрамі драўніны. Глеб жа ўмацаваў і павялічыў памеры замка: вышыня абарончых валоў пры ім дасягала васьмі метраў, а замкавыя сцены ўзвышаліся яшчэ на пяць. Таксама князь заклаў у замку мураваную царкву, якую, на жаль, не ўдалося дабудаваць. Пад уладай Глеба Усяславіча знаходзіліся землі ажно да Оршы і Копысі. Менскі князь быў настолькі заможным, што разам з жонкай ахвяраваў на патрэбы Кіеўскай Пячэрскай лаўры 140 кілаграмаў срэбра і 20 — золата.

Мінчукі і палачане XI стагоддзя адносіліся да розных плямёнаў — яшчэ Усяслаў Чарадзей заваяваў Мінск, дзе жылі дрыгавічы, і далучыў яго да свайго Полацкага княства, населенага крывічамі. Змагаючыся за новыя ўладанні, Глеб Усяславіч пастаянна супернічаў з кіеўскімі князямі за землі дрыгавічоў, а са смаленскімі — за Падняпроўе. Калі ў 1119 годзе кіеўскі княжыч Мсціслаў, сын Уладзіміра Манамаха, узяў Мінск у аблогу, Глеб Усяславіч з сям'ёй быў вымушаны выйсці з горада насустрач кіеўскаму войску, пасля чаго яго схапілі і даставілі ў Кіеў, дзе ў тым самым годзе ён і памёр — як мяркуецца, ва ўзросце каля шасцідзесяці гадоў. Сімвалічна, што "Аповесць мінулых гадоў", якая апісвае падзеі ад заснавання свету, завяршаецца менавіта паведамленнем аб гэтым здарэнні.

КАЛІ З'ЯВІЎСЯ ВЕРХНІ ГОРАД

Ян Глябовіч, выяўлены на карціне Уладзіміра Ганчарука, жыў у часы, калі Мінск ужо ўваходзіў у склад Вялікага Княства Літоўскага. Ён нарадзіўся ў 1544 годзе і ва ўзросце 19 гадоў падчас Лівонскай вайны ўдзельнічаў у абароне Полацка ад аблогі войскамі Івана Грознага. Падчас аднаго з рэйдаў за сцены замка Ян быў узяты ў палон і вывезены ў Маскву, дзе адзначыўся тым, што вёў з самім царом багаслоўскія дыспуты з пазіцый пратэстантызму — у выніку ў 1566 годзе яму ўдалося вярнуцца з палону на радзіму. Тут яго спрабавалі нават абвінаваціць у дзяржаўнай здрадзе, але Глябовічу ўдалося апраўдацца, давёўшы, што ён збіраў у Маскве разведвальную інфармацыю. Ужо ў 1571 годзе Ян Глябовіч быў прызначаны кашталянам у новаствораным Мінскім ваяводстве.

Уладзімір Тоўсцік. Партрэт Глеба Усяславіча.

Уладзімір Ганчарук. Партрэт Яна Глябовіча.

Уладзімір Ганчарук. Партрэт Кшыштафа Станіслава Завішы.

Уладзімір Зінкевіч. Партрэт Захара Карнеева.

Уладзімір Зінкевіч. Партрэт Вікенція Гячана-Гячэвіча.

Уладзімір Тоўсцік. Партрэт Караля Яна Гутэн-Чапскага.

Гісторык Алег Дзярновіч удакладняе, што кашталян быў намеснікам ваяводы, але ў яго адсутнасць з'яўляўся фактычным кіраўніком замка і яго наваколля — а ваяводы ў падначаленыя ім замкі наведваліся надта рэдка. Пры Яне Глябовічы ў Мінску быў збудаваны першы кальвінскі збор — пратэстанцкі малельны дом. Ён стаяў на сённяшняй вуліцы Інтэрнацыянальнай, якая ў тыя часы з гэтай прычыны звалася Зборавай (на адрэзку ад плошчы Свабоды ў бок Гарадскога Вала).

Яшчэ ў 1547 годзе Мінск пацярпеў ад вялікага пажару, і з Вільні была прысланая камісія, якая вызначыла новы накірунак развіцця горада. Такім чынам узнік так званы Высокі рынак, альбо Верхні горад — раён на паўднёвы ўсход ад замка, які пачалі забудоўваць у стылі барока акурат падчас кіравання ў Мінску Яна Глябовіча. І менавіта ў тыя ж часы, у 1581 годзе, Мінск, разам з Вільняй і Навагрудкам, стаў адным з гарадоў, дзе засядаў найвышэйшы апеляцыйны судовы орган Вялікага Княства Літоўскага — Галоўны Трыбунал. Памёр Ян Глябовіч у 1590 годзе, пакінуўшы Мінск з зусім іншым абліччам і статусам, чым раней.

ЯШЧЭ АДЗІН ДЗЕНЬ ГОРАДА

Партрэт Кшыштафа Станіслава Завішы таксама выканаў Уладзімір Ганчарук. Завіша, народжаны ў 1660 годзе, з 1685 быў мінскім старостам, а з 1720 — яшчэ і ваяводам. Ён вядомы сваімі літаратурнымі творамі ды мемуарамі, а таксама тым, што спрыяў пашырэнню асветы і развіццю духоўнага жыцця.

Менавіта падчас кіравання Кшыштафа Станіслава ў Мінску збудаваныя езуіцкі кляштар і калегіум з цяперашнім Архікафедральным касцёлам, дзе захоўвалася атрыманая Завішам ад Папы Рымскага хрысціянская рэліквія — частка мошчаў святога Феліцыяна, у гонар якога размешчаную непадалёк вуліцу назвалі Феліцыянаўскай (цяпер Камсамольская). А дата памінання Феліцыяна, 6 лютага, была ў XVIII стагоддзі своеасаблівым тагачасным Днём горада, бо святы лічыўся нябёсным апекуном Мінска.

ПЕРШАЕ ІМЯ ПРАСПЕКТА

Напрыканцы XVIII стагоддзя Мінск, у выніку раздзелаў Рэчы Паспалітай, апынуўся пад уладай Расійскай імперыі. Адным з самых вядомых кіраўнікоў Мінскай губерні быў другі па ліку — Захар Карнееў, які заняў гэтую пасаду ў 1796 годзе. Ягоны партрэт для мінскай ратушы выканаў Уладзімір Зінкевіч.

Менавіта пры Карнееве з'явіўся і пачаў рэалізоўвацца генеральны план Мінска, які ў многім сфарміраваў і вызначыў сённяшнюю планіроўку горада. Акурат паводле гэтага плана ўзнікла і вуліца Захар'еўская, названая ў гонар самога губернатара, якая ўжо ў XIX стагоддзі стала галоўнай гарадской артэрыяй, і сёння вядомая як праспект Незалежнасці. Таксама Захар Карнееў заклаў гарадскі парк, які тады называўся Губернатарскім садам, а сёння носіць імя Максіма Горкага.

ТЭАТР У РАТУШЫ

Сёмым па ліку мінскім губернатарам быў Вікенцій Гячан-Гячэвіч, партрэт якога таксама створаны Уладзімірам Зінкевічам. Гячан-Гячэвіч кіраваў у Мінску 13 гадоў, з 1818 да 1831 — на той час гэта быў вельмі доўгі тэрмін. Адметна, што ён быў адным з двух ураджэнцаў Беларусі на гэтай пасадзе (а ўсяго іх змянілася да 1917 года 30 чалавек). Як адзначае гісторык Андрэй Кіштымаў, цікава, што ў свой час Гячан-Гячэвіч распарадзіўся пераабсталяваць мінскую ратушу для патрэб гарадскога тэатра — то-бок, менавіта пры ім гэты будынак пачаў выкарыстоўвацца ў сферы культуры.

Адметна, што калі ў 1830 годзе на землях былой Рэчы Паспалітай пачалося паўстанне, адзін з сыноў губернатара служыў у царскім войску, а іншы апынуўся на баку інсургентаў. Тым не менш, гэта не перашкодзіла кар'еры самога Вікенція Гячан-Гячэвіча — ён пайшоў на павышэнне, і скончыў сваё жыццё ў Пецярбургу ў 1840 годзе.

ВУЛІЦА ЧАПСКАГА

На апошнім партрэце серыі, выкананым Уладзімірам Тоўсцікам, можна пабачыць гарадскога галаву Мінска Караля Яна Гутэн-Чапскага, які займаў гэтую пасаду з 1890 па 1901 год. Гарадскі галава — пасада выбарная, і займаў яе Гутэн-Чапскі ажно тройчы — тры кадэнцыі па тры гады (быў абраны і чацвёрты раз, але адмовіўся з-за хваробы). Менавіта пры ім у Мінску з'явілася першая электрастанцыя, а на гарадскіх вуліцах — конка, таксама адкрылася скатабойня, што значна палепшыла санітарны стан горада. Для атрымання дадатковых даходаў на карысць горада былі нават выпушчаныя адмысловыя аблігацыі.

Караль Ян Гутэн-Чапскі пакінуў па сабе ў мінчукоў настолькі добрую памяць, што пасля яго смерці была вынесеная прапанова назваць у яго гонар вуліцу Міхайлаўскую (сённяшняя Камуністычная) — але, на жаль, гэта так і не здзейснілася. Хто ведае, мо ў будучыні вуліцы нашай сталіцы яшчэ атрымаюць імёны герояў гэтай жывапіснай серыі? А сцены ратушы, тым часам, чакаюць партрэтаў наступных кіраўнікоў Мінска, якія дбалі пра развіццё і добраўпарадкаванне горада ў XX стагоддзі.

К

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тэл.: 327 45 62.
Пастаянныя экспазіцыі:
■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.";
■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.";
■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.";
■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.";
■ "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.";
■ "Мастацтва краін Усходу XIV — XX стст.".
Новы раздзел — **"Сусвет Язэпа Драздовіча".**
Выставы:
■ Унікальная выстава да 100-годдзя мастацкага аб'яднання УНОВІС **"Нас зразумеюць праз 100 гадоў. Лазар Хідэкель"** — да 15 красавіка.
■ Персанальная выстава Кастуся Качана **"Радзімаю зачараваны"** — да 15 сакавіка.
■ Персанальная выстава Віктара Маркаўца **"Класіка і этнамадэрн"** — да 15 сакавіка.
■ Выстава жывапісу і графікі Юрыя Хілько **"Цень ветру"** — да 16 сакавіка.
■ Выставачны праект Вольгі Сазыкінай **"Пра шкло"**.
■ Выстава **"Рускі імпрэсіянізм"**. Жывапіс, графіка

і скульптура Нацыянальнага мастацкага музея. Да 29 сакавіка.

Філіялы музея

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І ПАЛОВЫ XIX СТ."
г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.
Пастаянныя экспазіцыі:
■ **"Інтэр'еры шляхецкай сядзібы"**.
■ **"Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча"**.
■ **"Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст."**.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ
Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Повязь часоў"**, якая знаёміць з багаццем вобразаў традыцыйнага ручніка.
■ Майстар-клас па традыцыйнай тэхніцы роспісу вялікодных яек "Пісанкі". Кожную няделю а 12-й.

У МІНСКУ ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" МОЖНА НАБЫЦЬ У НАСТУПНЫХ КРОПКАХ:

магазіны "Белсаюздрук"	кіёскі "Белсаюздрук"
Падземны пераход ст.м. "Пятроўшчына".	**ст.м. "Няміга", вул. М. Багдановіча.**
Падземны пераход ст.м. "Плошча Перамогі".	**Праспект Пераможцаў, 5.**
	Вуліца Рабкораўская, 17.
Праспект Незалежнасці, 44.	**Праспект Незалежнасці, 68, В.**
Вуліца Валадарскага, 16.	**Вуліца Лабанка, 2.**

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 327 43 22.
Экспазіцыі:
■ Абноўленая экспазіцыя **"Старажытная Беларусь"**.
■ "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
■ Бестэрміновая акцыя **"Адзіны білет"**, якая дазваляе мінчанам і гасцям сталіцы наведаць музей і яго шэсць філіялаў, набыўшы ўсяго адзін білет у любым з іх.
■ Аўтарскі праект Ахрэма Белабровіка **VKL3D**.
■ Акцыя **"Вольнае піяніна"** — кожны дзень з 16.00 да 19.00.
Выставы:
■ Выстава **"Беларусь: адраджэнне духоўнасці"**.
■ Выстава **"Ад рымскага дэнарыя да беларускага рубля"**.
■ Выстава, прысвечаная творчым дасягненням мастака-пастаноўшчыка Кацярыны Булгакавай **"...Ад ідэі да тэатральнай сцэны..."** — да 15 сакавіка.
■ Фотавыстава **"Міхайлаўскае. Кабінет Пушкіна"** — да 22 сакавіка.
■ Выставачны праект **«Скарбонка добрых дробязяў»** — з 10 да 29 сакавіка.

Філіялы музея

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДУ РСДРП
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.
■ Абноўленая экспазіцыя **"Гісторыя сацыял-дэмакратычнага руху канца XIX — пачатку XX стст."**

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 38. Тэл.: 327 46 11.
■ Пастаянная экспазіцыя **"Сучасная гісторыя Рэспублікі Беларусь: 1991 — 2017 гг."**.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 327 06 33.
Экспазіцыі:
■ "Сезонныя змены".
■ "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
■ "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
■ "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
■ "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".
■ Атракцыён **"Стужачны лабірынт"**.
■ Атракцыён **"Лазерны квэст"**.
г. Мінск, вул. Багдановіча, 9а, Дом прыроды. Тэл.: 237 46 94.
■ Выстава **"Жывая экзотыка"** — да 26 лістапада.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ
г. Мінск, Музычны зав., 5. Тэл.: 220 26 67.
Пастаянныя экспазіцыі:
■ "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях"; "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст."; "Беларуская музычная культура XX ст."; "Тэатральная культура Беларусі XX ст.".
■ Выстава **"Песня — душа народа"** (да 80-годдзя Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы імя Р. Шырмы) — да 3 сакавіка.
■ Выстава **"Білет у савецкае дзяцінства"** — да 22 сакавіка.

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА
г. Мінск, вул. Старавіленская, 14. Тэл.: 286 74 03.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Паэзія вышыўкі"** — да 29 сакавіка.
Майстар-класы:
■ Музейныя заняткі **"Тэатральная лялька"** для дзяцей 5+.
■ Інтэрактыўныя музейныя заняткі **"Асновы акцёрскага майстэрства"** для дзяцей ад 5 да 10 гадоў.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО
г. Мінск, вул. Свярдлова, 4. Тэл.: 327 10 75.
■ Пастаянная экспазіцыя **"Гісторыя беларускага кінематографа"**.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ
г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8. Тэл. +375 (17) 203 07 92, +375 (29) 144 07 92, +375 (17) 327 11 66. Музей працуе: аўторак-нядзеля з 10.00 да 18.00 (касы да 17.30), панядзелак - выхадны.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Часовая экспазіцыя **"Нашчадкі Вялікай Перамогі"** (сумесна з ГА "Бабруйская гарадская дзіцяча-юнацкая ўзорная студыя выяўленчага мастацтва "Вясёлка") — да 27 сакавіка.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"
г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19. Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02; +37529 551 80 51, + 37529 190 31 49. Палацавы ансамбль
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Гістарычны квэст **"Таямніцы і загадкі палаца Радзівілаў"**. Па папярэдніх заяўках.
Ратуша: г. Нясвіж, вул. Савецкая, 3.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Квэст **"Выхадкі старога захавальніка"**. Па папярэдніх заяўках.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"
г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць. Тэл.: (8–01596) 2 82 90, (8–01596) 2 82 70.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Міжнародная выстава гістарычных карт **"Аб'ядноўваючы прастору і час"** — да 29 сакавіка.
■ Тэатралізаваная экскурсія **"Мірскі замак і яго ўладальнікі: шлях праз стагоддзі"**.
■ Экскурсія з элементамі дэгустацыі **"У госці да Пане Каханку"**.
■ Экскурсія з элементамі анімацыі і дэгустацыі **"Мірскі замак. Гісторыя. Культура. Дэгустацыя"**.
■ Тэматычная экскурсія з элементамі квэста для дваіх **"Інтрыгі Купідона"**.
■ Музейныя камунікатыўныя праграмы: **"Табе, нашчадак, у добры дар..."**, **"Ад усяго сэрца — самы лепшы пачастунак"**, **"Капрызы моды ракако"**.
■ Квэст **"Белы слон"**.
■ Дзіцячая тэатралізаваная экскурсія **"Чароўная гісторыя ў Мірскім замку"**.
■ Правядзенне вясельных цырымоній, святкаванне гадавіны вяселля.
■ Музейная фотапляцоўка.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА
г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5. Тэл.: 294 91 96.
Экспазіцыі:
■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
■ Экспазіцыя **"Склеп"** на сядзібе Якуба Коласа.
■ Праект **"Вайна і мір. Беларусь памятае"**, прымеркаваны да 75-годдзя Перамогі.
■ Тэматычныя экскурсіі

і лекцыйныя заняткі.
■ Тэатралізаваныя прадстаўленні паводле беларускіх народных казак.
■ Музейныя майстар-класы і заняткі.
■ Мультымедыйны комплекс **"Чалавек. Асоба. Час"**.
■ Пешая экскурсія **"Мясцінамі Коласа ў Мінску"**.
■ Інтэрактыўныя праграмы для сямейных наведвальнікаў, квэст-гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.
Акцыі:
■ **"Самы лепшы дзень"** (дзень нараджэння ў музеі).
■ Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"**

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА
г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Філіялы музея

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА
г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.
■ Адноўленая экспазіцыя **"Адкрыццё жывапісу"** (візуальная рэтраспектыва творчасці народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва).
■ Выстава **"Леаніду Шчамялёву — 97. Графіка**

з сямейнай калекцыі" — да 19 красавіка.
■ Рэтраспектыўная выстава жывапісу і графікі **"Пра жанчын і пра вясну ..."** — з 4 сакавіка да 19 красавіка.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА
г. Мінск, пл. Свабоды, 15. Тэл.: 321 24 30.
Экспазіцыі:
■ **"Мастак. Грамадзянін. Герой"**. Прысвечана Ганароваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.
■ **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт"**.
■ Выстава **"Сны аб Францыі"** — да 29 сакавіка.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША
г. Мінск, пл. Свабоды, 2а. Тэл.: 321 24 30.
Выставачныя праекты:
■ **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет"**.
■ **"Мінск сярод сяброў. Гарады-пабрацімы сталіцы Беларусі"**.
■ **"Археалагічныя артэфакты ў XII — XIX стст."**

АРХЕАЛАГІЧНЫ МУЗЕЙ
г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 6. Тэл.: 321 24 30.
■ Пастаянная экспазіцыя.

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"
г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 8. Тэл.: 321 24 30.
■ **"Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж"** (пастаянная экспазіцыя па гісторыі гужавога транспарту жыхароў Мінска XIX — пачатку XX стст.).
■ Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

ПА ПЫТАННЯХ РАЗМЯШЧЭННЯ РЭКЛАМЫ Ў ГАЗЕЦЕ "КУЛЬТУРА"
звяртайцеся па тэлефоне
+ 375 17 286 07 97
і па тэлефоне/факсе
+375 17 334 57 41
альбо пішыце на электронны адрас
kultura@tut.by!

ЭКСПАЗІЦЫЯ "МІНСКАЯ КОННАЯ ЧЫГУНКА"
г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 6.
■ Экспазіцыя складаецца з некалькіх раздзелаў, якія распавядаюць пра жыццё Мінска 1890 — 1920-х гг.

МУЗЕЙ "ЛОШЫЦКАЯ СЯДЗІБА"
г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 8-2.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Нальшанскія сустрэчы"** — да 29 сакавіка.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ
г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10. Тэл.: 285 18 86.
Экспазіцыя:
■ **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры кан. XIX — сяр. XX стст.

АРТ-ГАСЦЁЎНЯ "ВЫСОКАЕ МЬСТА"
г. Мінск, вул. Герцэна, 2а. Тэл.: 321 24 30.
■ Выстава работ Ганны Сілівончык **"Шмат літар"** — да 15 сакавіка.

НАВАГРУДСКІ ГІСТОРЫКА-КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ
г. Навагрудак, вул. Гродзенская, 2. Тэл. (8-01597) 2 14 70.
■ Пастаянная экспазіцыя: **"Гісторыя Навагрудчыны са старажытных часоў да Вялікай Айчыннай вайны"**.
г. Навагрудак, вул. Мінская, 64-66.
■ Экспазіцыя: **"Музей яўрэйскага супраціўлення на Навагрудчыне"**.

ДОМ-МУЗЕЙ АДАМА МІЦКЕВІЧА Ў НАВАГРУДКУ
г. Навагрудак, вул. Леніна,1. Тэл.: (8-01597) 2 43 40 (каса).
■ Пастаянная экспазіцыя: **"Жыццё і творчасць Адама Міцкевіча"**.
■ Пастаянныя выставы: **"Святло кухні Міцкевічаў"**, **"Малюнкі сельскага жыцця"**, **"Пан Тадэвуш" праз час і народы"**.

ГАЛЕРЭІ

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА
г. Мінск, вул. Казлова, 3. Тэл./факс: 290 60 10.
■ Выстава **"Шляхі нямецкага мастацтва"** — да 12 красавіка.

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1. Тэл./факс: 334 11 56.
■ **14, 15 — "Кошчын дом"** (опера ў 2-х дзеях) П.Вальдтгарта. Дырыжор — Алег Лясун. Пачатак а 12-й.
■ **14 — "Анюта"** (балет ў 2-х дзеях) В.Гаўрыліна. Дырыжор — Іван Касцяхін. Пачатак а 19-й.
■ **15 — "Паяцы"** (опера ў 2-х дзеях) Р.Леанкавала. Дырыжор — Іван Касцяхін. Пачатак а 18-й.
■ **17, 18 — "Рамэо і Джульета"** С. Пракоф'ева. Дырыжор — Андрэй Галанаў. Пачатак а 19-й.
■ **19 — "Травіята"** (опера ў 4-х дзеях) Дж. Вердзі. Дырыжор — Андрэй Галанаў. Пачатак а 19-й.
■ **20 — "Шкаўкунок, або Яшчэ аднакалядная гісторыя"** (балет ў 2-х дзеях) П.Чайкоўскага. Дырыжор — Мікалай Калядка.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"
г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. Тэл./факс: 154 04 44.
■ **14 — "Вар'ятка"** (трагіфарс у 2-х дзеях) Н. Птушкінай. Прэм'ера.
■ **15 — "Адамавы жарты"** (камедыя) С.Навуменка.
■ **17 — "Ціхі шэпат сыходзячых крокаў"** (сон у 2-х дзеях) Д. Багаслаўскі.
■ **18 — "Кар'ера доктара Рауса"** (трагікамедыя) В.Марціновіч.
■ **20 — "Білет на брэсцкі цягнік"** (камедыя) В.Каралёў.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"
г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2. Тэл.: (8-0212) 36 32 50.
■ **14 — "Горад клоўна Піка"** (Тэатральна-цыркавая фантазія на 1 дзею). Пачатак аб 11-й.
■ **15 — "Аладзін"** (для дзецей ад 6 год). Пачатак аб 11-й.
■ **16 — "Асцярожна, Соня!"** Пачатак а 18-й.